Погляд

# ДРУГОГА ТУРА НЕ БУДЗЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У Маскве многія небеспадстаўна думаюць, што «Мішу два працэнты» (такая мянушка захавалася за Касьянавым у гады яго працы ў міністэрстве фінансаў) нядобразычліўцы дапамаглі застацца за бартом вялікай палітычнай гульні пад назвай «Выбары прэзідэнта». І не таму, што крамлёўскія паліттэхнолагі прадказвалі Касьянаву, некалі любімчыку і надзеі ельцынскай «сям'і», высокі вынік на выбарах. Ён быў бы мінімальны. Рэпутацыю Касьянава моцна падмачылі сувязі з алігархамі, скандальная гісторыя з нахабнай прыхватызацыяй шыкоўнай саўмінаўскай дачы, іншыя непажаданыя моманты. Але ў ходзе дэбатаў ён у якасці кандыдата ў прэзідэнты мог бы на законнай аснове нагаварыць краіне шмат непажаданага.

Увогуле цяперашнія передвыбарныя дэбаты, мяркую па размовах з масквічамі, не вабяць выбаршчыкаў, як раней. Усё ці амаль усё яны некалі чулі ад іх удзельнікаў. Масквічы перакананыя, што прысутнасць на дэбатах Дзмітрыя Мядзведзева надала б ім вагу і выклікала б вялікую цікавасць. Ён жа самы рэальны прэтэндэнт. Але Мядзведзеву, кандыдату ад партыі ўлады, не патрэбны ўдзел у непрадказальных дэбатах. Яго больш чым дастаткова ў выгадным свеце штодзень піяраць федэральныя тэлеканалы ў рэпартажах аб рабочых паездках па краіне ў якасці першага намесніка кіраўніка ўрада.

Перад тэлекамерамі ў час дэбатаў Мядзведзеву абавязкова дасталася б ад Жырыноўскага і асабліва ад Зюганава. Апошні, я ўпэўнены, на ўсе сто выкарыстаў бы свой багаты вопыт публічнага палітыка, загартаваны ў мностве дыскусій і слоўных баталіях талент і майстэрства палеміста. А так яму даводзіцца спрачацца ў кампаніі кандыдатаў без аніякіх шанцаў на перамогу, нават на выхад у другі тур: старшынёй дэмакратычнай партыі Андрэем Багданавым і Уладзімірам Жырыноўскім.

Ну і што з таго, што Генадзь Андрэевіч, як і некалькі гадоў таму б'е крытыкай уладу, папярэджвае радавых людзей аб немінучым эканамічным крызісе, нястомна заклікае сродкі шматмільярднага стабілізацыйнага фонду ўкладваць у рэальную эканоміку, а не садзейнічаць амерыканскаму імперыялізму, павысіць істотна зарплаты і пенсіі. Дзе грошы ўзяць на павышэнне дабрабыту народа? У лідара КПРФ стары рэцэпт: нацыяналізаваць прыродныя багацці краіны, прышчучыць алігархаў. Але ў свядомасці многіх масквічоў гэтыя заходы і прапановы ўспрымаюцца як старыя песні на новы лад.

Уладзімір Жырыноўскі, заснавальнік жанру палітычнай клаунады ў Расіі, з усіх сілаў пхнецца ўсяляк спадабацца электарату. Адсюль і экстравагантныя, часам, я сказаў бы, вельмі спрэчныя і неадэкватныя высокаму статусу кандыдата ў прэзідэнты «думкі» і заявы, хамскія выбрыкі на дэбатах, праявы непавагі да апанентаў. Так, ён у тэлеэфіры без прычыны назваў Багданава прыдуркаватым чалавекам. Уладзімір Вольфавіч са скуры вылузваецца, каб сфакусіраваць увагу гледачоў і слухачоў на сваёй персоне.

Ён аб'явіў сябе рашучым абаронцам правоў рускіх у Расіі, заклікаў не пускаць у яе межы іншаземцаў, бо з-за іх у бедных рускіх няма работы і грошай. Як бы між іншым Жырыноўскі аднойчы паведаміў, што яго маці чыстакроўная руская, а ён (тут Вольфавіч адкрыў вялікі сакрэт) на самай справе не «сын юрыста». Яго бацька быў эканамістам ці бухгалтарам. Жырыноўскі без стомы шчодра раздае прэсе фантастычныя каментарыі, забаўляе маскоўскую публіку паездкамі ў грамадскім транспарце, палохае расіян і адначасова абяцае тое, што апрыёры не магчыма выканаць, у прыватнасці, усім без выключэння дараваць усе даўгі, якія існуюць у краіне. І недарэмна стараецца. Выбары — выдатная магчымасць захавацца ў памяці электарату на будучыню. Расіяне слухаюць гэту бязглуздзіцу, не вераць ёй, рагочуць, як у цырку (асабліва масквічы) і тым не менш значная частка выбаршчыкаў пастаянна галасуе за Жырыноўскага. Вось і зразумей гэту загадкавую рускую душу.

Вядомаа, сёння мяне, як і ўсіх суграмадзян, цікавіць у першую чаргу тое, як пасля выбараў будуць складвацца адносіны Беларусі і Расіі. Я не заўважыў (магчыма, не ўсё чуў і бачыў), каб у час палемікі на дэбатах і выступленнях па тэлебачанні кандыдаты ў прэзідэнты казалі нешта істотнае на карысць Саюзнай дзяржавы. Зюганаў аднойчы падчас крытыкі прамысловай палітыкі ўладаў між іншым прыгадаў, што Беларусь выпускае ў 10 разоў больш трактароў, чым Расія. Відаць, усе кандыдаты стаўку робяць на ўнутраныя пытанні.

На маё здзіўленне ў расійскай сталіцы ды і ў глыбінцы далёка не ўсе «на ўра» ўспрымаюць шырока разрэкламаваныя нацыянальныя праекты — галоўны козыр каманды Мядзведзева. Здавалася б, канкрэтныя вялікія і карысныя справы ў інтарэсах простага народа, але... Згодна з апытаннем аналітычнага цэнтра Юрыя Лявады ўзровень інфармаванасці насельніцтва аб нацыянальных праектах па-ранейшаму застаецца невысокім. Шмат расіян ставяцца да іх скептычна. Так, паводле даных апытання, 18 працэнтаў адказалі, што добра дасведчаны аб праектах, а 63 працэнты толькі нешта чулі пра іх. Амаль 30 працэнтаў рэспандэнтаў упэўнены ў тым, што праекты спецыяльна прымеркаваны да выбараў. 60 працэнтаў апытаных сумняваюцца ў тым, што рэалізацыя праектаў істотна паўплывае на іх жыццё.

Вытокі гэтага скепсісу ў велізарнай сацыяльнай няроўнасці, перадолець якую хутка не атрымаецца. Нават у Маскве, бадай, самым заможным рэгіёне Расіі, нармальна жывуць далёка не ўсе. Тыповая сітуацыя: сталая масквічка засталася жыць пасля смерці мужа ў стандартнай двухпакаёўцы. У ацяпляльны сезон за яе трэба выкладваць штомесяц 2800 рублёў з пенсіі ў 3200 рублёў. Добра, калі дарослыя дзеці дапамогуць. А калі не яны?

Па-рознаму ў Маскве ацэньваюць вынікі кіраўніцтва Уладзіміра Пуціна. Так, паводле слоў Зюганава, калі Пуцін прыйшоў да ўлады, у краіне было толькі 7 доларавых мільярдэраў, а сёння ўжо 78. Але гэта палемічны ход. У цэлым прэзідэнт нягледзячы на шматлікія сур'ёзныя ўнутраныя і знешнія праблемы ў краіне, лічаць многія масквічы, мае права з гонарам і пачуццём выкананага абавязку ўступіць месца ў Крамлі свайму загадзя старанна падабранаму пераемніку.

Сённяшняя Расія кардынальна адрозніваецца ад Расіі ельцынскай. Памятаю, калі першы прэзідэнт Расіі добраахвотна (на здзіўленне ўсім) датэрмінова пакінуў Крэмль, то тады моцна загаварылі аб канцы эпохі Ельцына. Хутка завершыцца тэрмін другога прэзідэнта. Але нешта не чуваць прадказанняў аб канцы эпохі Пуціна. Яго эпоха працягнецца пасля выбараў у справах Мядзведзева і новай прэзідэнцкай раці. У чым, дарэчы, не сумняваецца і сам Пуцін. Аб гэтым ён усім нагадаў у сваёй прамове-плане развіцця Расіі да 2020 года на пашыраным пасяджэнні Дзяржсавета, апошняй штогадовай прэс-канферэнцыі ў якасці прэзідэнта.

І другога тура, на мой погляд, хутчэй за ўсё не будзе.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

*г. Масква.*

Минский городской центр недвижимости

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА 28 ФЕВРАЛЯ 2008 ГОДА

**УП «Минский городской центр недвижимости» проводит открытый аукциона на право заключения договоров аренды сроком на 5 лет* не завершенных строительством офисных помещений в составе бизнес-центра (2-я очередь строительства) в «Центре коммерческих связей с гостиничным комплексом» по пр. Победителей в г. Минске после передачи объекта в хозяйственное ведение КУП «Бизнес-центр «Столица»**

| № лота | Тип помещения | Целевое назначение помещения | Общая площадь, кв.м | Начальная цена, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | *1 этаж* | | | |
| 1 | Помещение № 101 (3 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 145,245 | 2260 |
| 2 | Помещение № 103 (3 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 145,56 | 2260 |
| | *2 этаж* | | | |
| 3 | Помещение № 201 (2 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 147,33 | 2290 |
| 4 | Помещение № 202 (2 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 127,23 | 1980 |
| 5 | Помещение № 203 (2 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 146,13 | 2270 |
| 6 | Помещение № 204 (2 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 127,395 | 1980 |
| 7 | Помещение № 205 | Офис | 74,745 | 1160 |
| 8 | Помещение № 207 | Офис | 76,965 | 1200 |
| 9 | Помещение № 209 | Офис | 77,37 | 1200 |
| 10 | Помещение № 210 | Офис | 64,485 | 1000 |
| 11 | Помещение № 211 | Подсобное помещение | 31,92 | 490 |
| 12 | Помещение № 212 | Офис | 67,875 | 1050 |
| | *3 этаж* | | | |
| 13 | Помещение № 301 (2 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 147,33 | 2290 |
| 14 | Помещение № 302 (2 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 127,33 | 1980 |
| 15 | Помещение № 303 (2 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 146,13 | 2270 |
| 16 | Помещение № 304 (2 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 127,56 | 1980 |
| 17 | Помещение № 305 | Офис | 75,045 | 1170 |
| 18 | Помещение № 307 | Офис | 75,165 | 1170 |
| 19 | Помещение № 309 | Офис | 77,505 | 1200 |
| 20 | Помещение № 312 | Офис | 64,485 | 1000 |
| 21 | Помещение № 314 | Офис | 66,42 | 1030 |
| | *4 этаж* | | | |
| 22 | Помещение № 401 (2 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 147,33 | 2290 |
| 23 | Помещение № 402 (2 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 127,23 | 1980 |
| 24 | Помещение № 403 (2 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 146,13 | 2270 |
| 25 | Помещение № 404 (2 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 127,545 | 1980 |
| 26 | Помещение № 405 | Офис | 75,045 | 1170 |
| 27 | Помещение № 407 | Офис | 75,165 | 1170 |
| 28 | Помещение № 408 | Офис | 64,485 | 1000 |
| 29 | Помещение № 409 | Офис | 77,505 | 1200 |
| 30 | Помещение № 410 | Офис | 66.42 | 1030 |
| 31 | Помещение № 411 | Подсобное помещение | 31,92 | 490 |
| | *5 этаж* | | | |
| 32 | Помещение № 501 (2 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 147,705 | 2300 |
| 33 | Помещение № 502 (2 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 127,695 | 1980 |
| 34 | Помещение № 503 (2 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 146,565 | 2280 |
| 35 | Помещение № 504 (2 комнаты, санузел, коридор) | Офис | 127,545 | 1980 |
| 36 | Помещение № 505 | Офис | 75,225 | 1170 |
| 37 | Помещение № 507 | Офис | 75,3 | 1170 |
| 38 | Помещение № 508 | Офис | 62,895 | 970 |
| 39 | Помещение № 509 | Офис | 77,73 | 1200 |
| 40 | Помещение № 510 | Офис | 62,61 | 970 |

** В отдельных случаях договор аренды может быть заключен на срок 11 месяцев. При этом Мингорисполком гарантирует победителю аукциона продление заключенного договора аренды в течение пяти лет.*

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 % от начальной цены лота и плату за участие в аукционе в размере 4 базовых величин на р/с 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». Перечень необходимых документов и порядок их подачи определен условиями проведения аукциона. Условия и сроки оплаты: разовый платеж в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Арендуемая площадь помещений будет корректироваться с учетом мест общего пользования перед подписанием договора аренды. Договор аренды с победителем аукциона заключается в установленном порядке после передачи объекта в хозяйственное ведение КУП «Бизнес-центр «Столица». **Аукцион состоится 28 февраля 2008 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39. Документы на участие в аукционе принимаются по 28 февраля до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Контактный телефон: (017) 227-40-22. Интернет: www.mgcn.by.**

Минский городской центр недвижимости

## Извещение о проведении 28 февраля 2008 года 70-го открытого аукциона на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет*) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г. Минска

| № лота | Адрес, тип помещения, целевое назначение | Арендуемая площадь, кв. м | Начальная цена, тыс. руб. |
|---|---|---|---|
| | **КУП «ЖРЭО Заводского района г. Минска» тел. 285-56-02** | | |
| 1 | пр. Партизанский, 69, подвал (под непроизводственное – офис) | 127,2 | 1980 |
| | **КУП «ЖРЭО Ленинского района г. Минска» тел. 223-35-03** | | |
| 2 | ул. Кирова, 11, подвальное помещение, вход отдельный через подвал, имеется естественное освещение, требуется ремонт с восстановлением водоснабжения и электроэнергии (под непроизводственное – офис) | 19,95 | 310 |
| 3 | ул. К. Маркса, 8, подвальное помещение, вход через подъезд совместно с другими арендаторами, отсутствует естественное освещение, отопление (под непроизводственное – офис) | 71,24 | 1110 |
| | **КУП «ЖРЭО Московского района г. Минска» тел. 252-80-63, 207-10-89** | | |
| 4 | ул. Фабрициуса, 3, подвал жилого дома (под непроизводственное – офис) | 34,25 | 530 |
| | **КУП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска» тел. 213-29-60, 224-53-76** | | |
| 5 | ул. Кижеватова, 78, подвальное помещение в жилом доме (под непроизводственное – офис, смешанные цели) | 24,75 | 380 |
| 6 | ул. Ландера, 38а, помещение на 1 этаже жилого дома (под непроизводственное – офис, смешанные цели) | 10,25 | 160 |
| | **КУП «ЖРЭО Партизанского района» тел. 294-01-11** | | |
| 7 | ул. З. Бядули, 8, подвальное помещение (под непроизводственное – офис, производственные цели при условии выполнения требований МЧС) | 94,13 | 1460 |
| 8 | ул. Долгобродская, 11 подвальное помещение (под непроизводственное – офис, производственные цели при условии выполнения требований МЧС) | 179,9 | 2800 |
| 9 | ул. О. Кошевого, 1, подвальное помещение (под непроизводственное – офис, производственные цели при условии выполнения требований МЧС) | 73,47 | 1140 |
| 10 | ул. Козлова, 4, подвальное помещение (под непроизводственное – офис, производственные цели при условии выполнения требований МЧС) | 54,06 | 840 |
| 11 | ул. Первомайская, 11, помещение на 1 этаже (под непроизводственное – офис) | 8,5 | 130 |
| 12 | ул. Первомайская, 15, часть проходного подъезда (под торговлю цветами) | 17,6 | 1600 |
| | **УП «ЖРЭО Первомайского района» тел. 285-72-92** | | |
| 13 | ул. Городецкая, 64, помещение на 1 этаже на площадях опорного пункта РУВД Первомайского района (под непроизводственное – офис) | 19,93 | 310 |
| 14 | ул. Городецкая, 64, помещение на 1 этаже на площадях опорного пункта РУВД Первомайского района (под непроизводственное – офис) | 24,34 | 380 |
| 15 | ул. Городецкая, 64, помещение на 1 этаже на площадях опорного пункта РУВД Первомайского района (под непроизводственное – офис) | 40,26 | 630 |
| 16 | ул. Калиновского, 74/1, помещение на 1 этаже на площадях библиотеки (под непроизводственное – офис) | 60,1 | 930 |
| 17 | ул. Славинского, 37, помещение на 1 этаже на площадях опорного пункта РУВД Первомайского района (под непроизводственное – офис) | 11,08 | 170 |
| 18 | ул. Седых, 56, подвальное помещение (под непроизводственное – офис) | 97,3 | 1500 |
| | **КУП «ЖРЭО № 2 Фрунзенского района г. Минска» тел. 253-03-26** | | |
| 19 | ул. Притыцкого, 40, комната, общий вход с бытовым помещением ЖЭС (под непроизводственное – офис) | 43,93 | 680 |
| 20 | ул. Притыцкого, 78, помещение на 1 этаже, общий вход с аптекой (в том числе 103,22 кв. м – под склад медикаментов, 48,55 – под непроизводственное – офис) | 151,77 | 2360 |
| | **КУП «ЖРЭО Центрального района г. Минска» тел. 203-34-66, 203-79-43** | | |
| 21 | ул. Киселева, 47, помещение на 1 этаже жилого дома (под непроизводственное – офис) | 23,22 | 360 |
| 22 | пер. Нововиленский, 10, подвал, без туалета и водоснабжения, без естественного освещения, общий вход с жильцами дома (под непроизводственные или производственные цели) | 41,26 | 640 |
| | **КУП «Минская спадчина» тел. 226-53-04** | | |
| 23 | ул. Герцена, 6, помещение на 1 этаже и мансарды (под непроизводственное – офис) | 181,4 | 2820 |
| | **КУП «Минсктранс» тел. 219-86-78** | | |
| 24 | пер. Кооперативный, 12, часть комнаты на 1 этаже в административном здании (под оборудование связи) | 2,0 | 370 |
| 25 | ул. Филимонова, 63, помещение на 3-м этаже (под смешанные цели) | 52,35 | 810 |
| | **Филиал ОЦ «Волма» тел. 8017 14-521-40** | | |
| 26 | Минская обл., Червенский р-н, п. Озерный, 1 этаж лечебного корпуса (площадь под автомат по приготовлению горячих напитков) | 2,0 | 370 |
| 27 | Минская обл., Червенский р-н, п. Озерный, 1 этаж спального корпуса №1 (площадь под автомат по приготовлению горячих напитков) | 2,0 | 370 |
| 28 | Минская обл., Червенский р-н, п. Озерный, 1 этаж спального корпуса № 1 (площадь под игровой автомат «Кран-машина») | 2,0 | 370 |
| 29 | Минская обл., Червенский р-н, п. Озерный, 1 этаж спального корпуса № 1 (площадь под автомат по продаже чипсов, шоколадок и т.д.) | 2,0 | 370 |
| 30 | Минская обл., Червенский р-н, п. Озерный, 1 этаж спального корпуса № 2 (площадь под автомат по приготовлению горячих напитков) | 2,0 | 370 |
| 31 | Минская обл., Червенский р-н, п. Озерный, 1 этаж спального корпуса № 1 (площадь под игровой автомат «Кран-машина») | 2,0 | 370 |
| 32 | Минская обл., Червенский р-н, п. Озерный, 1 этаж спального корпуса № 1 (площадь под автомат по продаже чипсов, шоколадок и т.д.) | 2,0 | 370 |
| | **Комитет по здравоохранению тел. 223-59-47** | | |
| 33 | ул. Любимова, 6, помещение на 1-м этаже общежития, благоустроенное, вход отдельный (под любые цели, кроме парикмахерской, ритуальных услуг, ремонта обуви) | 41,57 | 640 |
| | **УЗ «6-я городская клиническая больница» тел. 246-24-21** | | |
| 34 | ул. Уральская, 5, помещение в цокольном этаже терапевтического корпуса (под мини-кафе) | 80,85 | 7500 |
| | **Главное управление потребительского рынка Мингорисполкома тел. 220-51-34, 219-00-784** | | |
| 35 | Торговый центр «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 9 (под розничную торговлю непродовольственными товарами) | 18,8 | 1750 |
| 36 | Торговый центр «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 10 (под розничную торговлю непродовольственными товарами) | 18,8 | 1750 |
| 37 | Торговый центр «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 16 (под розничную торговлю непродовольственными товарами) | 17,7 | 1650 |
| 38 | Торговый центр «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 18 (под розничную торговлю непродовольственными товарами) | 33,0 | 3100 |
| 39 | Торговый центр «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 20 (под розничную торговлю непродовольственными товарами) | 30,0 | 2800 |
| 40 | Торговый центр «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 23 (под розничную торговлю непродовольственными товарами) | 17,7 | 1650 |
| 41 | Торговый центр «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 26 (под розничную торговлю непродовольственными товарами) | 19,8 | 1850 |
| 42 | Торговый центр «Столица», пл. Независимости помещение № 320 (под объект общественного питания) | 789,45 | 12 300 |
| | **КУП «Минский городской центр недвижимости» тел. 227-46-39** | | |
| 43 | ул. Замковая, 28, помещение на 1 этаже (под производственные цели по согласованию с арендодателем) | 40,0 | 620 |
| | **УП «Олевма» тел. 234-42-24, 234-41-35** | | |
| 44 | ул. Богдановича, 147, помещение под торговлю зоологическими товарами | 6,5 | 300 |
| | **Управление бытового обслуживания населения тел. 200-99-90** | | |
| 45 | пр. Независимости, 40а, два помещения на 1 этаже (под мастерскую по ремонту РТА и бытовой техники, под другие производственные цели по согласованию с балансодержателем) | 12,48 | 195 |
| | **КУП «БытЭкс» тел. 203-79-66** | | |
| 46 | пр. Любимова, 26, корп. 3, помещение на 2 этаже (под мастерскую по ремонту часов) | 15,8 | 240 |
| 47 | ул. Ташкентская, 7, помещение № 11 на 4 этаже (под производственные цели) | 145,9 | 2270 |
| 48 | ул. Кульман, 5 помещение на 2 этаже (под торговлю товарами промышленной группы по согласованию с балансодержателем) | 15,1 | 240 |
| 49 | ул. Кульман, 5, смежные помещения №№ 22, 23, 24 на 4-м этаже (под бытовые услуги) | 33,6 | 520 |
| 50 | ул. Плеханова, 105, два помещения (под бытовые услуги) | 28,8 | 440 |
| 51 | ул. Пушкина, 8, два помещения, в т.ч. одно без естественного освещения (под непроизводственное – офис) | 51,7 | 800 |
| | **УП «Чайка» тел. 281-35-39** | | |
| 52 | ул. Пожарского, 27, две смежные комнаты № 13, № 21 (под непроизводственное – офис, смешанные цели) | 25,28 | 390 |
| | **УП «Белхимчистка» тел. 204-69-13** | | |
| 53 | пер. Ольшевского, 1, 8 помещений (№№ 28, 29, 30, 31, 32, 36, 37, 38) в административно – производственном здании, стеклопакеты, имеется телефон (под непроизводственное – офис) | 110,7 | 1720 |
| | **КУП «Минский мясокомбинат» тел. 296-12-52** | | |
| 54 | ул. Солтыса, 187, помещения в здании ФОКа: помещение площадью 189,5 кв. м – под производственные цели не связанные с вредным производством, помещение площадью 34,6 кв. м – под непроизводственное – офис | 224,55 | 3450 |
| 55 | ул. Солтыса, 187, помещения в здании ФОКа: помещение площадью 1520,1 кв. м – под производственные цели не связанные с вредным производством, помещение площадью 28,63 кв. м – под непроизводственное – офис | 1548,73 | 24130 |
| | **Минский профессионально-технический колледж сферы обслуживания тел. 272-73-92** | | |
| 56 | ул. Семашко, 7, подвальное помещение с отдельным входом (под производственные цели или склад) | 256,65 | 4000 |
| | **Учебный межшкольный учебно-производственный комбинат трудового обучения и профессиональной ориентации тел. 295-04-21** | | |
| 57 | ул. Плеханова, 16, часть холла на 1-м этаже (под автомат по приготовлению горячих напитков) | 3,0 | 560 |
| | **Минский государственный профессионально-технический колледж строителей им. В.Г. Каменского тел. 284-35-83** | | |
| 58 | ул. Гебелева, 5, часть холла на 1 этаже (под автомат по приготовлению горячих напитков) | 3,0 | 560 |
| | **УП «Механизированная уборка города» тел. 207-20-59** | | |
| 59 | пер. 2-й Прилукский, 8 каб. 410, помещение на 4 этаже АБК (под непроизводственное – офис) | 29,25 | 450 |
| | **ОАО «Стройтрест № 1» тел. 294-21-35** | | |
| 60 | ул. Пугачевская, 3, помещение на 2 этаже № 215, телефон не предоставляется (под непроизводственное – офис) | 23,79 | 370 |
| | **УП «Минские вторичные ресурсы» тел. 242-73-85** | | |
| 61 | ул. Брестская, 40Б, часть производственного помещения, (под производственные цели) | 92,23 | 1430 |
| | **КУП «Минская овощная фабрика» тел. 244-36-82** | | |
| 62 | Минский р-н, п/о Тростенец, д. Б. Стиклево, кирпичное здание, требующее ремонта, без воды, телефона, электроэнергии (под производственные цели) | 138,0 | 2150 |
| 63 | Минский р-н, п/о Тростенец, д. Б. Стиклево, открытая площадка (под склад, возможно разделение на части) | 100,0 | 1550 |
| 64 | Минский р-н, п/о Тростенец, д. Б. Стиклево, открытая площадка (под склад) | 500,0 | 7790 |
| | **Управление образования администрации Московского района г. Минска тел. 272-21-94** | | |
| 65 | ул. Хмелевского, 12а, помещение в средней общеобразовательной школе № 105 (под непроизводственное – офис) | 17,1 | 260 |
| | **КУП «Городские парки Минскзеленстроя» тел. 280-04-49** | | |
| 66 | ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. Горького, площадка для реализации детской книги** | 2,0 | 370 |
| 67 | ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. Горького, площадка № 1 для реализации изделий народного промысла** | 4,0 | 740 |
| 68 | ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. Горького, площадка № 1 для реализации услуг по рисованию портретов, шаржей** | 2,0 | 370 |
| 69 | ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. Горького, площадка № 2 для реализации услуг по рисованию портретов, шаржей** | 2,0 | 370 |
| 70 | ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. Горького, площадка № 3 для реализации услуг по рисованию портретов, шаржей** | 2,0 | 370 |
| 71 | ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. Горького, площадка № 4 для реализации услуг по рисованию портретов, шаржей** | 2,0 | 370 |
| 72 | ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. Горького, площадка № 5 для реализации услуг по рисованию портретов, шаржей** | 2,0 | 370 |
| 73 | ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. М. Горького, площадка № 10 для реализации мороженого и прохладительных напитков (подключение коммуникаций – 220 вольт необходимой мощности, вода и канализация отсутствуют)** | 4,0 | 740 |
| 74 | ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. Горького, площадка под аттракцион «Силомер»** | 1,0 | 185 |
| 75 | пр. Независимости, 84, территория парка культуры и отдыха им. Челюскинцев, площадка № 1 для реализации услуг по рисованию портретов, шаржей** | 2,0 | 370 |
| 76 | пр. Независимости, 84, территория парка культуры и отдыха им. Челюскинцев, площадка № 2 для реализации услуг по рисованию портретов, шаржей** | 2,0 | 370 |
| 77 | пр. Независимости, 84, территория парка культуры и отдыха им. Челюскинцев, площадка № 3 для реализации услуг по рисованию портретов, шаржей** | 2,0 | 370 |
| 78 | пр. Независимости, 84, территория парка культуры и отдыха им. Челюскинцев, площадка под аттракцион «Комната смеха»** | 50 | 2300 |
| 79 | пр. Независимости, 84, территория парка культуры и отдыха им. Челюскинцев, площадка под аттракцион «Караоке»** | 8,0 | 750 |

** В отдельных случаях договор аренды может быть заключен на срок 11 месяцев. При этом Мингорисполком гарантирует победителю аукциона продление заключенного договора аренды в течение пяти лет.*

***Требуется согласование ассортимента реализуемого товара и услуг с органами санитарно-эпидемиологического контроля и торговыми отделами администраций Партизанского, Первомайского районов г. Минска соответственно. Продолжительность сезона с 15.04.2008 по 15.10.2008 (может быть увеличена по желанию арендатора). Внешний вид объекта согласовывается с УП «Городские парки Минскзеленстроя» и соответствующими службами администраций Партизанского, Первомайского районов г. Минска.*

**Организатор аукциона (продавец) – КУП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.**

Участник аукциона до начала его проведения должен выяснить у балансодержателя возможность использования помещения под планируемые виды деятельности, в том числе с учетом требований по санитарным и противопожарным нормам. Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены лота и плату за участие в аукционе в размере 4 базовых величин на расчетный счет 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости», представляет нотариально заверенную копию свидетельства о регистрации юридического лица или индивидуального предпринимателя. Порядок подачи документов определен условиями проведения аукциона. Условия и сроки оплаты: разовый платеж в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в установленном порядке в 30-дневный срок с даты принятия решения Мингорисполкома.

**Аукцион состоится 28 февраля 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Документы на участие принимаются по 27 февраля 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Телефоны для справок (017) 227-40-22, 227-48-36. Интернет: www.mgcn.by.**

*Целевое назначение помещений* определяется в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 30 сентября 2002 г. № 495 «О совершенствовании порядка определения размеров арендной платы и передачи в безвозмездное пользование общественных, административных и переоборудованных производственных зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности» и предусматривает:

- *«непроизводственное целевое использование»* — использование помещений для размещения руководителей, органов управления и контроля юридических лиц и их структурных подразделений, а также специалистов по снабжению и сбыту, финансово-экономических служб, бухгалтерий;
- *«смешанное целевое использование»* — использование помещения одновременно в производственных и непроизводственных целях;
- *«производственное целевое использование»* — использование помещения непосредственно для выпуска продукции, выполнения работ и оказания услуг с размещением на арендуемых площадях рабочих и специалистов, а также для складирования продукции, товаров. К помещениям производственного целевого использования относятся также помещения актовых, спортивных, выставочных залов, подсобные помещения, предназначенные для обслуживания деятельности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей (кладовые, раздевалки, умывальники, комнаты для приема пищи), др.

*Порядок определения размеров арендной платы* при сдаче в аренду зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности, установлен Указами Президента Республики Беларусь от 30 сентября 2002 г. № 495 «О совершенствовании порядка определения размеров арендной платы и передачи в безвозмездное пользование общественных, административных и переоборудованных производственных зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности» и от 4 августа 2006 г. № 498 «О некоторых вопросах аренды государственного имущества».

# ТВАЕ ПРАВЫ

Інфармацыя. Парады. Дапамога.

№ 2 (6)

## Кватэрнае пытанне
# ПА ПРАЕКТУ...

**Напішыце, якія работы павінны выконвацца ў кватэрах пры капітальным рамонце дома? Ці ёсць па гэтым пытанні афіцыйныя нарматыўныя дакументы?**

**В. Бароўка,** *г. Паставы.*

Загадам Мінжылкамгаса ад 25 лістапада 2004 г. № 196 зацверджаны Метадычныя рэкамендацыі па планіраванні капітальнага рамонту жыллёвага фонду. Пастановай Мінбудархітэктуры, Мінжылкамгаса і Камітэта па энергаэфектыўнасці ад 31 сакавіка 2004 г. № 6/7/3 зацверджаны, у прыватнасці, гранічныя нормы затрат на капітальны рамонт і цеплавую мадэрнізацыю 1 кв. метра агульнай плошчы кватэр жылых дамоў.

Загадам Мінжылкамгаса ад 30 снежня 2006 г. № 209 даручана кіраўнікам абласных і Мінскага гарадскога ўпраўленняў жыллёвай гаспадаркі, рамонтна-будаўнічых арганізацый галіны забяспечыць з 1 студзеня 2007 года на зноў пачатых аб'ектах рамонту жылых дамоў заключэнне дагавораў паміж заказчыкам, падраднай арганізацыяй і грамадзянінам на выкананне рамонтна-будаўнічых работ.

На стадыі праектавання капітальнага рамонту жылога дома павінна праводзіцца абавязковае абследаванне ўсіх канструктыўных элементаў дома і інжынерных сістэм з мэтай недапушчэння аб'ёмаў дадатковых работ, што выяўляюцца ў працэсе правядзення рамонтна-будаўнічых работ. Праектная дакументацыя на капітальны рамонт жылога дома падлягае ўзгадненню з зацікаўленымі, разгляду ў дзяржаўнай экспертызе і зацвярджэнню ва ўстаноўленым парадку.

Рэкамендаваны пералік асноўных відаў рамонтна-будаўнічых работ, што выконваюцца пры капітальным рамонце будынкаў і збудаванняў, выкладзены ў дадатку А да Будаўнічых нормаў Рэспублікі Беларусь (БНБ 1.04.02-02) «Рамонт, рэканструкцыя і рэстаўрацыя жылых і грамадскіх будынкаў і збудаванняў».

Ва ўказаны пералік уключаны, у прыватнасці, наступныя віды работ:

перакладка і ўзмацненне асобных участкаў каменных сцен;

аднаўленне або ўзмацненне асобных прасценкаў, перамычак, карнізаў;

герметызацыя стыкаў элементаў паўназборных будынкаў;

умацаванне, узмацненне або замена перагародак;

дадатковае ўцяпленне паддашкавых перакрыццяў і пакрыццяў;

частковая або поўная замена дахаў, аконных пераплётаў з каробкамі;

замена няспраўных унутраных інжынерных сістэм і абсталявання, а таксама зношанага абсталявання ліфтаў, смеццеправодаў;

замена бытавога газавага абсталявання;

рамонт і замена ліфтаў без змянення тэхнічных характарыстык;

замена і рамонт зношаных элементаў унутрыкватэрных і вонкавых інжынерных сетак;

рамонт фасадаў з уцяпленнем асобных участкаў і іншае.

Перыядычнасць правядзення капітальнага рамонту прымаецца ў адпаведнасці з Тэхнічным кодэксам існуючай практыкі ТКП 45-1.04-14-2005 «Тэхнічная эксплуатацыя жылых і грамадскіх будынкаў і збудаванняў». Напрыклад, для паўназборных буйнапанэльных жылых дамоў, буйнаблочных, са сценамі з цэглы, натуральнага каменю і да т.п. з жалезабетоннымі перакрыццямі пры нармальных умовах эксплуатацыі рэкамендавана мінімальная працягласць эфектыўнай эксплуатацыі да пастаноўкі на капітальны рамонт у межах 15—20 гадоў.

На капітальны рамонт павінны ставіцца, як правіла, будынак (аб'ект) у цэлым або яго частка (секцыя, некалькі секцый). Пры неабходнасці можа ажыццяўляцца капітальны рамонт асобных канструктыўных элементаў будынка або аб'екта.

Не пазней чым за 30 дзён да пачатку правядзення капітальнага рамонту павінен быць праведзены сход жыльцоў дома з прадастаўленнем ім інфармацыі (памяткі) аб відах і тэрмінах правядзення рамонтных работ, арганізацыі і тэхналогіі іх правядзення. Пытанні, якія ўзняты грамадзянамі ў перыяд правядзення капітальнага рамонту і не патрабуюць дадатковага абследавання і разгляду з іншымі зацікаўленымі, павінны вырашацца неадкладна. Прыёмка выкананых рамонтна-будаўнічых работ павінна ажыццяўляцца па кожнай кватэры са складаннем акта, падпісанага заказчыкам, падраднай арганізацыяй і грамадзянінам.

# ПЛАЦІЦЬ БЫ РАДЫ. АЛЕ ЗА ШТО?

**Мы пастаянна пералічваем сродкі на «тэхнічнае абслугоўванне». А на што канкрэтна, калі акрамя дворнікаў і сантэхнікаў дом, здаецца, ніхто не абслугоўвае?**

**В. Бароўка,** г. Паставы.

У адпаведнасці з артыкулам 51 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь наймальнікі, уласнікі жылых памяшканняў, члены арганізацыі грамадзян-забудоўшчыкаў абавязаны штомесяц удзельнічаць у фінансаванні ў шматкватэрных жылых дамах долі затрат па фактычных расходах, звязаных з эксплуатацыяй і рамонтам дапаможных памяшканняў, канструкцыйных элементаў, інжынерных сістэм, утрыманнем прыдамавых тэрыторый (т.з. плата за «тэхнічнае абслугоўванне») суразмерна з агульнай плошчай жылых памяшканняў, якую яны займаюць.

Згодна з Інструкцыяй аб парадку аплаты жыллёва-камунальных паслуг (зацверджана пастановай Мінжылкамгаса ад 24 мая 2004 г. № 13) тэхнічнае абслугоўванне жылога дома ўключае работы падрадных арганізацый па бягучым утрыманні жылых дамоў і прыдамавых тэрыторый (бягучая эксплуатацыя і рамонт агульнай маёмасці жылых дамоў, прыбіранне і асвятленне дапаможных памяшканняў, прыдамавой тэрыторыі).

Агульная маёмасць жылога дома: міжкватэрныя лесвічныя клеткі, лесвіцы, ліфты, ліфтавыя і іншыя шахты, калідоры, дахі, тэхнічныя паверхі і падвалы, іншыя часткі і месцы агульнага карыстання, несучыя, абмежавальныя ненясучыя канструкцыі, а таксама механічнае, электрычнае, сантэхнічнае і іншае абсталяванне, якое знаходзіцца за межамі або ўнутры жылых і (або) нежылых памяшканняў, элементы інжынернай інфраструктуры, азеляненне і добраўпарадкаванне, асобныя аб'екты, якія служаць мэтаваму выкарыстанню будынка, — усё вышэйпералічанае знаходзіцца ў карыстанні ўласнікаў і наймальнікаў жылых памяшканняў і з'яўляецца неад'емнай часткай жылога дома.

Утрыманне тэрыторыі каля дома ўключае работы па прыбіранні смецця, снегу, рамонце пакрыццяў праездаў, праходаў, догляду зялёных насаджэнняў і інш.

У цэлым тэхнічнае абслугоўванне жылога дома павінна ўключаць работы па кантролі і забеспячэнні належнага тэхнічнага стану будынка, забеспячэнні працаздольнасці і спраўнасці ўсіх яго інжынерна-тэхнічных сістэм, падрыхтоўцы да сезоннай эксплуатацыі, а таксама за забеспячэнні выканання санітарна-гігіенічных патрабаванняў да ўстройства, абсталявання і ўтрымання жылых дамоў і прыдамавых тэрыторый.

**Віктар САВІЦКІ.**

### Вызначаны памер утрымання з наймальнікаў сродкаў для забеспячэння своечасовай выплаты зарплаты

Пры разліку сродкаў, якія падлягаюць першачарговаму пералічэнню плацежкаю на пагашэнне запазычанасці па заработнай плаце, наймальнікі павінны браніраваць у разліку на аднаго работніка Br340 тыс. 440. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу Беларусі. Гэты нарматыў прымяняецца з дня яго афіцыйнага апублікавання.

### Вадзіцелі, беражыце грошы!

**ДАІ Мінска штодзень карае за невыкарыстанне рамянёў бяспекі больш за 200 вадзіцеляў.**

Як паведамілі БЕЛТА ў Дзяржаўтаінспекцыі ГУУС Мінгарвыканкама, у сталіцы стартавала бестэрміновая акцыя «Не забудзь прышпіліцца!». ДАІ мае намер узмацніць кантроль за выкананнем гэтай нормы правілаў дарожнага руху як вадзіцелямі, так і пасажырамі. Акрамя таго, будуць прыцягвацца да адказнасці вадзіцелі, якія карыстаюцца мабільнымі тэлефонамі падчас руху. У ДАІ падкрэслілі, што да парушальнікаў прымяняюцца максімальныя штрафы, прадугледжаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам. Так, за невыкарыстанне рамянёў бяспекі прадугледжана пакаранне ў памеры Br35 тыс., а за карыстанне мабільным тэлефонам — Br70 тыс.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Пытальнік
# Якія плюсы долевага будаўніцтва...

**Пасля змяшчэння ў нашым выданні артыкула аб долевым будаўніцтве, дзе вялася гаворка аб указе кіраўніка дзяржавы № 55, у рэдакцыю пачалі звяртацца чытачы газеты з новымі пытаннямі на гэту тэматыку. У прыватнасці, Сафія Ліпко з Мінска пытаецца, якім чынам у долевае будаўніцтва можа ўступіць маладая сям'я, якая не мае свайго жылля і ўжо не адзін год лічыцца маючай патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў?**

— Удзельнічаць па лініі долевага будаўніцтва гэта сям'я можа па двух варыянтах, — **патлумачыў рэдакцыі начальнік жыллёвага будаўніцтва Мінбудархітэктуры Аляксандр ГОРВАЛЬ.** — Магчыма трапіць у пералік, які складаецца выканкамамі менавіта з чаргавікоў, для ўключэння ў якасці дольнікаў у канкрэтны жылы дом. Каштаваць такія кватэры будуць толькі на 5 працэнтаў даражэй, чым адпаведнае жыллё, якое будуецца горадам з дзяржаўнай падтрымкай для чаргавікоў. Паводле другога варыянта, стаць кліентам долевага будаўніцтва ў свабодным парадку пасля заключэння з забудоўшчыкам дагаворнага пагаднення. У гэтым выпадку каштаваць такое жыллё будзе значна даражэй, у залежнасці ад рынкавага попыту на яго з боку насельніцтва.

**— Які прыкладны кошт квадратнага метра будзе існаваць для чаргавікоў, якія трапяць у выканкамаўскі пералік?**

— Па выніках мінулага года квадратны метр агульнай плошчы ў стандартных панэльных дамах, што будаваліся менавіта для чаргавікоў, склаў прыкладна 450—500 долараў, у цагельных дамах — каля 650 долараў. Сёлета жыллёвы «квадрат» ужо на некалькі працэнтаў падаражэў. У дольнікаў, што будуць будавацца менавіта ў якасці маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, да вышэйназванага кошту трэба будзе прыплюсаваць яшчэ 5 працэнтаў.

**— Што вы параіце маладой сям'і нашай чытачкі для вырашэння жыллёвага пытання зрабіць у першую чаргу?**

— Неабходна звярнуцца ў мясцовы выканкам і напісаць там заяву аб уключэнні сям'і ў долевае будаўніцтва.

**— Ці можа такая сям'я атрымаць ільготны крэдыт пад будаўніцтва жылля, якое ажыццяўляецца па лініі долевага будаўніцтва?**

— Ільготныя крэдыты выдаюцца незалежна ад формы будаўніцтва. Права на атрыманне льготнага крэдыту вызначаецца ў залежнасці ад памераў даходаў сям'і і ад часу пастаноўкі на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

**— Які прыкладна тэрмін будаўніцтва «долевых» дамоў?**

— Тэрмін будаўніцтва залежыць ад канструкцыі дома. Калі гэта звычайны панэльны дом, то тэрмін яго ўзвядзення будзе ад 9 да 12 месяцаў. Па індывідуальным праекце, дзе існуюць спецыфічныя ўмовы будаўніцтва, тэрмін узвядзення шматкватэрнага дома можа дасягаць ужо 1,5—2 гады. У Мінску для чаргавікоў будуецца галоўным чынам індустрыяльнае жыллё — панэльнае, або буйназборнае і буйнаблочнае. Такое жыллё будуецца ў тэрмін да года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Начальнік, плаці грошы своечасова!

**За парушэнне тэрмінаў выплаты зарплаты летась у Віцебскай вобласці заплацілі штрафы каля ста наймальнікаў на агульную суму амаль 60 мільёнаў беларускіх рублёў. Аб гэтым паведамілі «Звяздзе» ў Камітэце дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці.**

Таксама прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці за такія парушэнні і 109 службовых асобаў на суму 18,6 мільёна рублёў.

Па выніках праверкі, праведзенай абласным упраўленнем Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы, кіраўнік навукова-вытворчага прадпрыемства, што дзейнічае ў Бешанковічах, заплаціў штраф у памеры 1,4 мільёна рублёў.

Больш за тое, па факце няправільна складзеных даных, перададзеных у якасці справаздачы статыстычнаму органу, матэрыялы былі накіраваны ў пракуратуру Бешанковіцкага раёна для разгляду пытання аб узбуджэнні крымінальнай справы ў дачыненні да адказных асобаў гэтага прадпрыемства.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ВЫБІРАЕШ? ЗВАЖАЙ НА... ЗДАРОЎЕ

**Жаданне плюс рэальныя ацэнкі сваіх ведаў. На першы погляд, усе ўмовы для паспяховага паступлення ёсць, дастаткова толькі выбраць «уласную» навучальную ўстанову. Аднак не зусім. Бо нялішне нагадаць: пры падачы дакументаў у ВНУ, тэхнікум, каледж, вучылішча і нават на курсы ў абавязковым парадку запатрабуюць прынесці медыцынскую даведку. І калі-нікалі якраз гэта становіцца зусім не меншым «выпрабаваннем».**

### Вышыня — не для павышанага ціску

Вядома, што любая работа мае свае асаблівасці, тут існуюць пэўныя «вытворчыя фактары», таму скідваць з рахункаў іх уплыў на стан здароўя ні ў якім разе нельга. І ў першую чаргу, калі гаворка ідзе аб спецыяльнасцях, звязаных з фізічнай працай.

— Перад тым, як зрабіць канчатковы выбар на карысць тых жа будаўнічых спецыяльнасцяў, мы раім вельмі добра падумаць падлеткам з захворваннямі сардэчна-сасудзістай сістэмы, — кажа старэйшы навуковы супрацоўнік лабараторыі прафесійнай экспертызы асобаў з абмежаваннямі жыццядзейнасці Навукова-даследчага інстытута медыка-сацыяльнай экспертызы і рэабілітацыі Людміла Аўсянікава. — Бо маляры, мантажнікі, муляры і тынкоўшчыкі часта працуюць на вышыні. А вышыня для чалавека з захворваннямі сэрца ці высокім крывяным ціскам заўсёды з'яўляецца дадатковай рызыкай.

Апроч таго, працягвае Людміла Аўсянікава, «сардэчнікам» пажадана не працаваць на электраабсталяванні, падлеткам з парушэннямі вастрыні зроку варта пазбягаць зноў-такі даволі папулярных і высокааплатных будаўнічых спецыяльнасцяў, парушэнні ва ўспрыняцці колераў могуць стаць перашкодай для работы ў будаўніцтве, металургіі, радыёэлектроннай прамысловасці, на транспарце і ў сувязі, дзе, цалкам верагодна, давядзецца «шукаць» для злучэння белыя, чырвоныя ці зялёныя правады.

Далей. Пры значных парушэннях слыху не варта звязваць свой лёс з работай на электраабсталяванні, з будаўніцтвам, металургіяй і іншымі «шумнымі» прафесіямі. Работа ў хімічнай вытворчасці, на вуліцы, на прадпрыемствах з высокім узроўнем пылу і са шкоднымі ўмовамі будзе далёка не лепшым варыянтам для асобаў з захворваннямі органаў дыхання, а работа, звязаная з пастаяннымі нагрузкамі на пазваночнік, ніжнія і верхнія канечнасці — для асобаў з парушэннямі апорна-рухальнага апарата. Зрэшты, яно і нядзіўна — да прыкладу, токару, слесару, фрэзероўшчыку, электраманцёру, дарожнаму рабочаму, манцёру пуцей і нават паштальёну амаль увесь працоўны дзень давядзецца праводзіць «на нагах».

### Камфортныя ўмовы з варыянтамі

Асобная гаворка аб патэнцыяльных абітурыентах вышэйшых навучальных устаноў. Нягледзячы на адносна «камфортныя ўмовы» будучай работы, свае ўмовы ёсць і тут. Скажам, да агульных проціпаказанняў для навучання ў ВНУ адносяцца сур'ёзныя праблемы з лёгкімі, сардэчна-сасудзістай сістэмай, пячонкай, ныркамі, эндакрыннай сістэмай, цяжкія псіхічныя захворванні. І, плюс да таго, вызначаны пэўныя «непажаданыя адхіленні» для кожнай канкрэтнай спецыяльнасці.

Скажам, да будучых эканамістаў, будаўнікоў і праграмістаў існуюць асаблівыя патрабаванні па зроку. З пункту гледжання ўласнай бяспекі і бяспекі калег інжынерам лясной прамысловасці проціпаказаны некаторыя захворванні цэнтральнай і перыферычнай нервовай сістэмы (да прыкладу, радыкуліт) і эпілепсія. У непажаданы спіс для юрыстаў уваходзяць зноў-такі сур'ёзныя захворванні цэнтральнай і перыферычнай нервовай сістэмы, заіканне, кепскае ўспрыманне шэпту і маўлення. Заатэхнікам і аграномам рэкамендуецца не мець значных пытанняў з сардэчна-сасудзістай сістэмай, пячонкай і ныркамі, для інжынерна-тэхнічнага персаналу ў харчовай прамысловасці (зразумела, што тут давядзецца працаваць пры павышанай тэмпературы) «выключаюцца» сур'ёзныя парушэнні сардэчна-сасудзістай сістэмы, інфекцыйныя захворванні і цяжкія захворванні лёгкіх, а для настаўнікаў — астма, высокая ступень артэрыяльнай гіпертэнзіі, значныя праблемы са зрокам, слыхам і насаглоткай, заіканне.

І яшчэ. Як зазначае Людміла Аўсянікава, асобная група — навучальныя ўстановы Міністэрства абароны, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Тут патрабаванні будуць нашмат больш жорсткімі, прычым даведацца аб іх лепш за ўсё загадзя ў саміх жа «сілавых» ВНУ.

### Не забудзьцеся звярнуцца да ўрача

Трэба падкрэсліць, што сама па сабе наяўнасць таго ці іншага захворвання яшчэ не з'яўляецца «прысудам». Любое парушэнне мае пэўную ступень «цяжкасці», таму з кожным падлеткам трэба разбірацца асобна, а рашэнне можа прымацца толькі з улікам індывідуальнага клінічнага прагнозу. Адно, заўважае Людміла Аўсянікава, перад канчатковым выбарам пажадана «не забыцца» звярнуцца па кансультацыю да свайго ўрача ў паліклініцы. Тым больш, што тут жа будзе магчымасць падрабязна пазнаёміцца з поўным пералікам проціпаказанняў па той ці іншай спецыяльнасці.

— Лепш за ўсё прыйсці да свайго ўрача не непасрэдна перад падачай дакументаў на паступленне, а недзе ўжо ў 7—8-м класе, — працягвае Людміла Аўсянікава. — Бо калі ўрач дасць дабро, можна спакойна рыхтавацца да набыцця любімай прафесіі, а калі згоды не будзе — застанецца час, каб без рэзкага стрэсу паспрабаваць пераарыентавацца на іншую, магчыма, сумежную спецыяльнасць. Пры гэтым у другім выпадку галоўнае — ні ў якім разе не драматызаваць сітуацыю. Падлеткі і іх бацькі павінны разумець, што прафесія выбіраецца на ўсё жыццё, і, адпаведна, трэба думаць, што будзе праз 10—15 гадоў. Бо існуе верагоднасць, што пад уплывам пэўных умоў работы захворванне пачне прагрэсаваць, а страту здароўя ніколі не заменяць ніякія, нават вялікія, заробкі.

**Сяргей ГРЫБ.**

# Каментарый аб парадку індэксацыі даходаў насельніцтва за студзень 2008 года

Грашовыя даходы насельніцтва, што атрымліваюцца з бюджэтных крыніц (заработная плата; грашовае забеспячэнне ваеннаслужачых тэрміновай службы і сувораўцаў; дзяржаўныя стыпендыі навучэнскай моладзі), дапамогі і стыпендыі беспрацоўным на перыяд прафесійнай падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі па накіраванні дзяржаўнай службы занятасці за студзень гэтага года індэксацыі не падлягаюць. Як растлумачыў карэспандэнту БЕЛТА намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Пётр Грушнік, гэта абумоўлена тым, што індэкс спажывецкіх цэнаў не перасягнуў пяціпрацэнтны парог да лістапада і снежня 2007 года.

Індэксацыя заработнай платы дзяржаўных служачых і прыраўнаваных да іх асобаў, грашовае забеспячэнне ваеннаслужачых і асобаў радавога і начальніцкага складу ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 21 снежня 1990 года № 476-XII «Аб індэксацыі даходаў насельніцтва з улікам інфляцыі» праведзена за студзень 2008 года ў выглядзе аднаразовага перагляду памераў аплаты працы.

Насельніцтву, якое атрымлівае даходы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з іншых крыніц, кампенсацыя страт ад інфляцыі ажыццяўляецца па падставах, прадугледжаных калектыўнымі дагаворамі (пагадненнямі).

Нагадаем, індэксацыя ажыццяўляецца па нарматыву, устаноўленаму Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2006 года № 55 «Аб нарматыве індэксацыі грашовых даходаў насельніцтва з улікам інфляцыі». Індэксуецца даход у межах 100 працэнтаў зацверджанага бюджэту пражытковага мінімуму, дзеючага на момант індэксацыі, — цяпер гэты нарматыў роўны Br200 тыс. 80. Частка даходу, якая перавышае гэту суму, індэксацыі не падлягае.

## «Здавайся» загадзя
# Падаць дэкларацыю магчыма па папярэднім запісе

**Сёлета падатковую дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе за 2007 год неабходна падаць да 1 сакавіка. Дэкларацыю павінны падаць тыя фізічныя асобы, якія на працягу года атрымлівалі даходы з некалькіх крыніц, што абкладаюцца падаходным падаткам і іх сукупны гадавы даход перавысіў 7 519 992 рублі.**

Паводле інфармацыі прэс-цэнтра Міністэрства па падатках і зборах Беларусі, у сувязі з тым, што сёлета апошні дзень падачы дэкларацыі прыпадае на выхадны дзень, апошнім днём падачы дэкларацыі вызначана лічыцца 3 сакавіка. Сёлета, згодна з даручэннем МПЗ, усе інспекцыі з 11 лютага працуюць да 20.00, па суботах і 2 сакавіка з 9.00 да 15.00. Аднак многія інспекцыі ўжо працуюць па змененым графіку, таму рэжым працы іх трэба ўдакладняць.

Больш за тое, у інспекцыях працуюць асобныя кабінеты, у якіх прыём дэкларацый ажыццяўляецца па папярэднім запісе. Запіс у гэту асобную чаргу робіцца падаткаплацельшчыкамі па тэлефоне.

Рэкамендацыі і прыклады па запаўненні дэкларацый размешчаны на стэндах у раённых інспекцыях, а таксама на афіцыйным сайце Міністэрства па падатках і зборах Беларусі — http:/ nalog.by.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ВАМ АДКАЗВАЕ ЮРЫСТ

Алена ДЗЕВОЙНА

РУБРЫКУ ВЯДЗЕ

# ЦІ ЗАХАВАЕЦЦА ПЕНСІЯ?

**Мая сваячка ўдава, у яе двое дзяцей паўтара і пяці гадоў. Яны атрымліваюць пенсію па страце карміцеля. Ці захаваецца гэта пенсія, калі сваячка выйдзе замуж, а таксама калі новы муж усынавіць яе дзяцей?**

**Н. Іванова,** *г. Слонім.*

Адказ на ваша пытанне ўтрымліваецца ў Законе Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні» і ў артыкуле 135 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і.

Як устаноўлена артыкулам 35 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні», права на пенсію з выпадку смерці карміцеля маюць непрацаздольныя члены сям'і памерлага карміцеля, якія знаходзіліся на яго ўтрыманні. Пры гэтым дзецям пенсіі прызначаюцца незалежна ад таго, ці знаходзіліся яны на ўтрыманні карміцеля.

Згодна з артыкулам 39 Закона, пенсія, якая прызначана з выпадку смерці карміцеля, захоўваецца і пры ўступленні пенсіянера ў новы шлюб.

Артыкулам 40 гэтага Закона таксама ўстаноўлена, што непаўналетнія дзеці, якія маюць права на пенсію з выпадку смерці карміцеля, захоўваюць гэта права таксама і пры іх усынаўленні.

Такім чынам, паколькі пенсія па страце карміцеля вашай сваячцы і яе дзецям была ўжо прызначана, то ў новым шлюбе, а таксама ў выпадку ўсынаўлення дзяцей яна захаваецца.

Пенсія з выпадку смерці карміцеля ўстанаўліваецца на ўвесь перыяд, на працягу якога член сям'і памерлага лічыцца непрацаздольным згодна з артыкулам 35 Закона. Асобы ва ўзросце ад 18 гадоў і старэйшыя, якія навучаюцца на дзённай форме навучання ва ўстановах, што забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі (акрамя ўстаноў адукацыі, у перыяд вучобы ў якіх навучэнцы знаходзяцца на вайсковай службе, на службе ў органах унутраных спраў, органах і падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях, органах фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь), спецыяльнай адукацыі, перападрыхтоўкі кадраў, маюць права на пенсію з выпадку страты карміцеля да заканчэння імі такога навучання, але не болей чым да дасягнення 23-гадовага ўзросту.

# Камітэт дзяржкантролю выявіў на аўтазапраўках Мінска разбаўлены бензін

**Камітэт дзяржаўнага кантролю Беларусі правёў на працягу двух дзён рэйд па аўтазаправачных станцыях Мінска.**

У выніку выяўлена, што якасць нафтапрадуктаў, якія рэалізоўваліся на трох з пяці правераных АЗС, не адпавядае нарматыўна-тэхнічным патрабаванням, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе КДК.

Так, на дзвюх АЗС выяўлена рэалізацыя каля 7 тыс. літраў аўтабензіну АІ-95 з прымесямі дызельнага паліва (8—12 працэнтаў). Яшчэ на адной АЗС рэалізоўвалася 10,7 тыс. літраў бензіну маркі «Рэгуляр-92» і 3 тыс. літраў бензіну маркі АІ-95 з паніжанай актанавай колькасцю.

## Школа падаткаплацельшчыка
# Калі права на падатковы вылік дае дэкларацыя аб сукупным гадавым даходзе

*Рэдакцыя працягвае адказваць на самыя актуальныя пытанні нашых чытачоў. Сёння чарговую кансультацыю нашаму выданню дае* ***старшы дзяржаўны падатковы інспектар Міністэрства па падатках і зборах Павел СЛЕСАРАЎ.***

**— У маёй сям'і трое дзетак, якім ад 2 месяцаў да 4 гадоў. Летам жонку, якая была ў дэкрэтным водпуску, звольнілі з прыватнай фірмы ў сувязі з ліквідацыяй арганізацыі. Калі я правільна зразумеў, то зараз яна з'яўляецца ўтрыманкай. Сям'я складаецца з 5 чалавек. Не так даўно я пачаў працаваць у пасольстве, дзе заробкі выплачваюць у доларах ЗША. Як правільна цяпер трэба плаціць падаткі і колькі ў маёй сітуацыі магу атрымаць падатковых вылікаў? Калі я правільна падлічыў, то атрымліваецца, што, згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 3 красавіка 2007 года № 162, з майго даходу будзе рабіцца вылік па падаходным падатку ў памеры 13 базавых велічынь. Больш за тое, у адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 13 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб падаходным падатку з фізічных асобаў» пры вызначэнні памеру падатковай базы плацельшчык мае права на атрыманне стандартнага падатковага выліку ў памеры дзвюх базавых велічынь на кожнага ўтрыманца за кожны месяц падатковага перыяду. Растлумачце, на якую суму мне даецца падатковы вылік і якія трэба мець для гэтага дакументы? Растлумачце на прыкладзе, калі ўявіць, што я атрымліваю заработную плату ў памеры 600 долараў у месяц.**

**Іван КУЛІК,** *г. Мінск.*

— Вашы даходы падлягаюць падаткаабкладанню ў парадку, які вызначаны артыкулам 22 Закона «Аб падаходным падатку з фізічных асобаў». Дзеля гэтага вам неабходна падаць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік падатковую дэкларацыю (разлік) аб атрыманым на працягу падатковага перыяду сукупным гадавым даходзе не пазней за 1 сакавіка. Пры вызначэнні памеру падатковай базы вы маеце права на атрыманне адной базавай велічыні за кожны месяц падатковага перыяду, у памеры дзвюх базавых велічынь на ўтрыманца за кожны месяц (утрыманцам у вашым выпадку з'яўляецца жонка) і чатырох базавых велічынь на кожнае дзіця за кожны месяц падатковага перыяду, бо з'яўляецеся бацькам траіх дзяцей. Гэтыя стандартныя падатковыя вылікі ў агульным памеры 15 базавых велічынь у месяц прадастаўляюцца падатковым органам пасля прад'яўлення вамі наступных дакументаў:

— копій пасведчання аб нараджэнні дзіцяці;

— даведкі аб знаходжанні жонкі ў водпуску па догляду дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў або аб перыядзе выплачвання дапамогі на дзяцей, якая пацвярджае выплату дапамогі па догляду дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў;

— копіі вашай працоўнай кніжкі (пры яе адсутнасці — пісьмовая заява з указаннем прычын яе адсутнасці).

Прыклад: 20 снежня 2007 года вамі атрыманы даход у памеры 600 долараў ЗША. Курс долара ЗША на 20 снежня склаў 2154 рублі. Сума вашага даходу складае 1 292 400 рублёў (600 USD x 2154 рублі).

Стандартныя падатковыя вылікі складаюць 525 000 рублёў (15x35 000 рублёў), дзе 35 000 — гэта базавая велічыня.

Сума абкладаемага сукупнага даходу складае 767 400 рублёў (1 292 400 — 525 000 рублёў).

Сума падатку з абкладаемага сукупнага даходу склала 69 066 рублёў (767 400 x 9 працэнтаў).

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**


**Жодинский сельский исполнительный комитет (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводят открытый аукцион**

по продаже жилого дома № 34 (общ. пл. 49,6 кв.м) с пристройкой и сараем, расположенного по ул. Партизанской в д. Калюжки Смолевичского р-на. Пл. зем. участка 0,1950 га. Начальная цена – 20 662 217 бел. руб. Задаток в размере 5 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект производится в течение 30 дней с даты проведения торгов. Договор купли-продажи заключается в течение 5 рабочих дней после полной оплаты. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 18.03.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 17.03.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны: (8017) 2246134, (801776) 44616.**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

**Уважаемые акционеры ОАО «Минскконтракт»**
**28 марта 2008 года состоится общее собрание акционеров**
**ПОВЕСТКА ДНЯ**
**общего собрания акционеров**

*28 марта 2008 г.* *г. Минск*

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2007 году и основных направлениях деятельности на 2008 год (докладчик — генеральный директор Плавский В.Л.).
2. О работе наблюдательного совета Общества в 2007 году (докладчик — председатель наблюдательного совета Кузурова Л.П.).
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссии финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2007 год (докладчик — председатель ревизионной комиссии Рудинский В.А.).
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков за 2007 год (докладчик — главный бухгалтер Шавель И.С.).
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2007 год и плана распределения нераспределенной прибыли на 2008 год и I квартал 2009 года (докладчик — председатель наблюдательного совета Кузурова Л.П.).
6. Об увеличении уставного фонда ОАО «Минскконтракт» (докладчик — председатель наблюдательного совета Кузурова Л.П.).
7. О внесении изменений в Устав ОАО «Минскконтракт» (докладчик — председатель наблюдательного совета Кузурова Л.П.).
8. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии (докладчик — генеральный директор Плавский В.Л.).
9. Определение условий материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии (докладчик — генеральный директор Плавский В.Л.).
10. О наделении наблюдательного совета полномочиями принимать решения, отнесенные в соответствии с Уставом к компетенции собрания акционеров (докладчик — представитель государства в органах управления Общества — главный специалист управления собственности и владельческого надзора ГО «Белресурсы» Нелюбина Н.К.).

*Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в общем собрании акционеров ОАО «Минскконтракт» — 15 февраля 2008 года.*

*Место проведения собрания: г. Минск, ул. Пулихова, 15 (здание УП «Минскводоканал», актовый зал).*

*С материалами можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 19 марта 2008 года по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Смоленская, 27, отдел экономики и планирования) с 9.00 до 17.00, либо 28 марта 2008 года по месту проведения собрания: г. Минск, ул. Пулихова, 15 (здание УП «Минскводоканал», актовый зал).*

*Регистрация участников собрания 28 марта 2008 года с 14.00 до 14.45 по месту проведения собрания.*

***Начало работы собрания — 28 марта 2008 г., в 15.00.***

**Для регистрации акционеры предоставляют паспорт, представители акционеров — паспорт и доверенность.** УНН 100251588

**Наблюдательный совет ОАО «Світанак» г. Жодино сообщает, что 21.03.2008 года в 15.00 в актовом зале административно-бытового корпуса (ул. 8-е Марта, 1) состоится очередное собрание акционеров.**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2007 году и основных направлениях деятельности Общества на 2008 год.
2. О результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2007 год.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках Общества.
4. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении предприятия, принятие решения о сроках выплаты дивидендов за 2007 год.
5. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2008 год.
6. Отчет о работе наблюдательного совета в 2007 году.
7. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Утверждение размера вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Оказание безвозмездной (спонсорской помощи) в 2008 году.

*Регистрация участников собрания будет производиться с 13.00 до 14.50 в день и по месту проведения собрания по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителей акционеров — по доверенности.*

*С материалами повестки дня можно ознакомиться в библиотеке профкома с 15 марта 2008 года.* УНН 600038919

Краіна здароўя
Выпуск № 8 (64)


Фота БЕЛТА.

Доктар адкажа

## Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

**На наступным тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:**

**18 лютага** — намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскай клінічнай бальніцы паталогіі слыху, голасу і маўлення Галіна Дзяменцьеўна ВАСІЛЬЕВА.

**19 лютага** — галоўны ўрач Рэспубліканскай дзіцячай бальніцы медыцынскай рэабілітацыі Галіна Мікалаеўна РАДЗІВОНАВА.

**20 лютага** — галоўны спецыяліст упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Вікторыя Пятроўна ВАЙЦЯХОВІЧ.

**21 лютага** — галоўны ўрач Мінскага абласнога скурна-венералагічнага дыспансэра Людміла Аляксандраўна КАЛАСКОВА.

**22 лютага** — галоўны спецыяліст упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Іван Мікалаевіч РЫЖКО.

*Графік работы «гарачай» лініі з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.30. У графіку магчымыя змяненні.*

Пытальнік

## Чым небяспечны дэфіцыт жалеза?

***Маёй дачцэ ўрач паставіў дыягназ «анемія» і прапісаў лячэнне прэпаратамі жалеза. Да мяне не зусім зразумела, адкуль у дзяўчынкі-падлетка ўзялася анемія? І што адбываецца ў арганізме пры дэфіцыце жалеза?***

**Н.К.**, *Маладзечанскі раён.*

На жаль, жалезадэфіцытная анемія распаўсюджана вельмі шырока. Часцей за ўсё ад яе пакутуюць жанчыны рэпрадуктыўнага ўзросту, цяжарныя, маленькія дзеці і людзі састарэлага ўзросту. Паводле інфармацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, ад анеміі церпіць кожная трэцяя жанчына і кожны трэці мужчына ў свеце.

Прычынамі развіцця жалезадэфіцытнай анеміі могуць быць:

— павышаная патрэба маладога арганізма ў жалезе у перыяд інтэнсіўнага росту;

— незбалансаванае і непаўнавартаснае харчаванне, асабліва ў дзяцей і старых;

— захворванні кішэчніка, пры якіх парушаецца ўсмоктванне жалеза, што паступае з ежай;

— цяжарнасць і лактацыя;

— нязначныя страты крыві (часта непрыкметныя для хворага) ці працяглыя страты пры наяўнасці язвы, эрозій слізістай страўніка, стрававода, кішэчніка, гемарою, пухліны страўніка, кішэчніка без выражаных сімптомаў захворвання;

— матачныя крывацёкі;

— некантралюемы прыём лекаў;

— інтэнсіўныя фізічныя нагрузкі, спорт.

Але навошта ўвогуле патрэбна арганізму чалавека жалеза? Жалеза ўваходзіць у склад гемаглабіну (жалезазмяшчальнага бялку эрытрацытаў крыві), міяглабіну (мышачнага бялку) і розных ферментаў, якія адказваюць за нармальнае функцыянаванне скуры, слізістых абалонак, нервовай і іншых сістэм арганізма чалавека.

Але наш з вамі арганізм засвойвае з любой ежы не больш як 2,5 мг жалеза ў суткі. А калі яго сярэднясутачныя страты перавышаюць паступленне, у чалавека развіваецца дэфіцыт жалеза. Пры дэфіцыце жалеза арганізм пачынае браць яго з «запаснікоў», у першую чаргу, на вытворчасць гемаглабіну. Вось чаму кроў рэагуе на недахоп жалеза ў апошнюю чаргу, а першапачаткова церпяць тканкі арганізма.

Першымі сімптомамі недахопу жалеза з'яўляюцца павышаная стамлянасць, мышачная слабасць, нервознасць, санлівасць днём і дрэнны сон ноччу. На гэта часта не звяртаюць увагі, спісваючы недамаганне на ўзрост, хранічныя захворванні, высокія нагрузкі на рабоце ці вучобе. Прыкладна праз паўгода запасы жалеза ў арганізме значна змяншаюцца. Гэта прыводзіць да зніжэння сінтэзу гемаглабіну і жалезазмяшчальных ферментаў, у выніку пагаршаецца забеспячэнне тканак кіслародам, парушаюцца акісляльныя працэсы ў клетках. Вельмі адчувальныя да гіпаксіі сэрца, галаўны мозг і нервы. Да далейшых сімптомаў далучаюцца галаўныя болі, галавакружэнне, страта прытомнасці, пацямненні ў вачах, аддышка пры нагрузцы, боль у сэрцы, якая дрэнна ўстараняецца звыклымі прэпаратамі, бледнасць скуры, якая набывае алебастравае ці зеленаватае адценне, сухасць скуры, трэшчынкі ў кутках рота, ломкасць пазногцяў, выпадзенне і ломкасць валасоў (асабліва ў жанчын), змяненне языка (быццам яго апяклі), развіццё неадэкватных схільнасцяў (жаданне ўдыхаць пах бензіну, ацэтону, фарбаў, пабелкі і агіда да паху поту, цыгарэтнага дыму, алкаголю, ці жаданне з'есці мел, вапну, зямлю, попел).

Асноўны метад лячэння жалезадэфіцытнай анеміі — замяшчальная тэрапія прэпаратамі жалеза. Пры гэтым варта мець на ўвазе, што прымаць «жалеза» для прафілактыкі нельга — яго лішак таксама можа пацягнуць праблемы. Прэпараты жалеза трэба прымаць за 30 хвілін да яды або праз 2 гадзіны пасля яды. Не трэба запіваць прэпараты гарбатай, паколькі ў гарбаце прысутнічае танін, які можа ўтвараць з жалезам нерастваральныя спалучэнні. Усмоктванне прэпаратаў жалеза ўскладняецца пры адначасовым прыёме солей кальцыю (глюканату ці карбанату кальцыю), фосфарнай кіслаты, тэтрацыкліну, альмагелю і фосфалюгелю.

Падчас лячэння, а таксама для прафілактыкі жалезадэфіцыту ў рацыён павінны ўключацца прадукты, багатыя на жалеза — гэта мяса, морква, гранаты, арэхі. Пры гэтым памятайце, што лепш за ўсё жалеза засвойваецца з мяса, а ў найменшай ступені з агародніны і садавіны.

### У БАЛЬНІЦЫ — МУЗЕЙ

Яго стварыў персанал Буда-Кашалёўскай ЦРБ у выніку шматгадовай работы па зборы матэрыялаў. І сёння па іх прасочваюцца ўсе этапы развіцця сістэмы аховы здароўя ў раёне, расказваецца аб медыках-ветэранах вайны і працы, аб дасягненнях у лячэбна-прафілактычнай рабоце, культурных і спартыўных мерапрыемствах і г.д. Чым не добрая справа?

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

**Графік дзяжурстваў на «гарачай» лініі ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (220 20 25):**

**19 лютага:**

9.00—12.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічнай бальніцы Алена Леанідаўна БОГДАН, 14.00—17.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічнай бальніцы Анатоль Іванавіч СЯДЫХ.

**26 лютага:**

9.00—12.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Аляксандр Іванавіч КАРАНЕВІЧ, 14.00—17.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічнай бальніцы Яраслаў Леанідавіч ПЕРАЛЫГІН.

## Заменнікі цукру правакуюць павелічэнне вагі

**Штучныя заменнікі цукру прыводзяць да павелічэння вагі нягледзячы на тое, што практычна не змяшчаюць калорый. Аб гэтым сведчаць вынікі даследавання, праведзенага супрацоўнікамі Даследчага цэнтра паводзінаў чалавека Універсітэта Пурдзью (Purdue University), перадаюць інфармагенцтвы.**

Спецыялісты выкарысталі лабараторных пацукоў для параўнання аналізу ўздзеяння цукру і яго некаларыйнага сурагату на жывы арганізм. Грызуноў падзялілі на дзве групы: адну кармілі ёгуртам на глюкозе, а другую — ёгуртам з сахарынам (гэта рэчыва ў сотні разоў саладзейшае за цукар, і пры гэтым практычна не змяшчае калорый). Жывёлін не абмяжоўвалі ў ежы.

Як паказалі назіранні, пацукі, якія атрымлівалі ёгурт з сахарынам, набіралі вагу значна хутчэй, паколькі елі нашмат больш за сваіх сабратоў. Больш за тое, нават наступная дыета, на якую іх пасадзілі эксперыментатары, не дала належнага эфекту: вярнуцца ў ранейшую форму жывёліны так і не змаглі.

Сахарын прытупляе рэакцыю арганізма на салодкае. У норме салодкі смак дапамагае арганізму ацаніць каларыйнасць ежы, запускаючы адпаведныя абменныя працэсы і абмяжоўваючы апетыт.

Замена цукру падсаладжвальнікам можа прывесці да парушэння гэтага натуральнага механізму кантролю. У пацукоў, якія ўжываюць заменнік цукру, моцна запавольваецца абмен рэчываў, з-за чаго арганізм перастае нармальна спальваць атрыманыя «цукровыя» калорыі, і яны адкладваюцца ў выглядзе лішніх кілаграмаў.

«Мы дакладна ўстанавілі: ужыванне заменніку цукру хутчэй прывядзе да атлусцення, чым звычайны, каларыйны цукар», — зрабілі выснову эксперты, адзначыўшы, што выяўленыя імі заканамернасці актуальныя для ўсіх відаў нізкакаларыйнага сурагату. Яны прызналі, што іх даследаванне патрабуе далейшай работы, а яго прамежкавыя вынікі, напэўна, выклічуць нараканні з боку вытворцаў і прадаўцоў «дыетычных» падсаладжвальнікаў.

Штучныя заменнікі цукру шырока выкарыстоўваюцца ў так званых дыетычных версіях папулярных прадуктаў, прызначаных для спажыўцоў, якія заклапочаны праблемай лішняй вагі. Аднак вынік такой падмены можа аказацца прама процілеглым чаканаму. Ускосным сведчаннем на карысць гэтай гіпотэзы служыць і паралельны рост узроўню атлусцення і спажывання сінтэтычных заменнікаў цукру ў прамыслова развітых краінах.

Аднак шматлікія спробы ацаніць уплыў штучных падсаладжвальнікаў на вагу чалавека да апошняга часу прыводзілі да неадназначных вынікаў. Часткова гэта тлумачыцца тым, што, у адрозненне ад грызуноў, людзі здольныя свядома кантраляваць колькасць ежы, зыходзячы з яе каларыйнасці.

**Кар. БЕЛТА.**

## ЖАНЧЫНЫ ВЫБІРАЮЦЬ ВІТАМІНЫ, А МУЖЧЫНЫ — ЗАНЯТКІ Ў ТРЭНАЖОРНАЙ ЗАЛЕ

Здароўе ўсё ў большай ступені ўсведамляецца беларусамі як галоўная каштоўнасць. Гэта, у прыватнасці, пацвярджаюць вынікі праведзенага ў рамках выставы «Тыдзень моды на здароўе» спецыялістамі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя сацыялагічнага даследавання.

Усяго апытаннем былі ахоплены 440 наведвальнікаў выставы. Абсалютная большасць апытаных (94,5 працэнта) пагадзіліся з меркаваннем, што сярод беларусаў існуе мода на здаровы лад жыцця. 77,3 працэнта ацанілі сваё стаўленне да здароўя як уважлівае і клапатлівае. Абыякавасць да здароўя ў большай ступені характэрная для прадстаўнікоў узроставай групы ад 26 да 30 гадоў (32 працэнты), а разбуральнае — для 16—20-гадовых (12,8 працэнта).

Даследаванне прадугледжвала вывучэнне суб'ектыўнай ацэнкі наведвальнікамі выставы стану свайго здароўя. Больш за палову апытаных (58,2 працэнта) паведамілі, што лічаць сябе здаровымі (у прыватнасці, 69,5 працэнта мужчын і 54 працэнты жанчын). Пры гэтым высветлілася, што мужчыны значна часцей, чым жанчыны робяць ранішнюю зарадку (44,7 працэнта супраць 30,1), больш актыўна займаюцца спортам (27,1 працэнта супраць 13,7), наведваюць басейны і трэнажорныя залы (30,6 працэнта супраць 25,7 працэнта), лазню і саўну (40 працэнтаў супраць 31), а таксама больш актыўна загартоўваюцца (23,5 працэнта супраць 20,9).

Жанчыны, у сваю чаргу, больш сур'ёзна ставяцца да свайго харчавання (78,6 працэнта супраць 52,9), часцей прымаюць вітаміны (62,7 працэнта супраць 44,7), імкнуцца кантраляваць сваё псіхічнае здароўе (51,6 працэнта супраць 40), чытаюць літаратуру аб захаванні і ўмацаванні здароўя (76,4 працэнта супраць 52,9), глядзяць тэлеперадачы аб здароўі (60 працэнтаў супраць 45,9) і не злоўжываць спіртнымі напоямі (86 працэнтаў супраць 69,4).

Найбольш высокі ўзровень фізічнай актыўнасці выяўлены сярод моладзі. Але менавіта маладыя людзі менш за астатніх сочаць за сваім харчаваннем, і іх мала цікавяць тэлепраграмы аб здароўі.

Дарэчы, больш як 74 працэнты апытаных паведамілі, што прыйшлі на выставу, каб атрымаць новую інфармацыю аб захаванні і ўмацаванні здароўя, 65 працэнтаў — каб набыць інфармацыйна-даведачныя матэрыялы, 32 працэнты — для кансультацыі са спецыялістамі, а 11,6 працэнта прызналіся, што галоўны іх матыў — звычайная цікаўнасць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Бяспечнае харчаванне

## ТЛУШЧЫ: НЕ БОЙСЯ Ў ЦЭЛЫМ, АБМЯЖУЙ У ПРЫВАТНАСЦІ

**Не злоўжывайце тлустай ежай, але і ні ў якім разе не выдаляйце яе цалкам з рацыёну свайго харчавання.**

Дыетолагі раяць зменшыць ужыванне тлушчаў самым простым спосабам — скараціць у рацыёне долю мяса, хлебабулачных вырабаў і смажанай ежы. Там, дзе гэта магчыма, варта імкнуцца есці рыбу замест мяса і выкарыстоўваць масла для бутэрбродаў з нізкім утрыманнем тлушчу.

Увогуле выдаліць тлушчы з рацыёну мы не можам, напрыклад, таму, што некаторыя вітаміны атрымліваем толькі з імі. Гэта вітаміны А, Д, Е, К, якія яшчэ называюць тлушчарастваральнымі. Неабходна, праўда, імкнуцца да таго, каб суадносіны ненасычаных і насычаных тлустых кіслот складалі 2:1. Да прадуктаў з высокім утрыманнем ненасычаных тлушчаў адносяцца раслінны алей і некаторыя віды арэхавага (але не какосавы, у якім асабліва шмат насычаных тлустых кіслот). Да насычанай тлустымі кіслотамі ежы адносяцца малочныя і мясныя вырабы, сала.

Тлушчы дзеляцца на некалькі розных груп: насычаныя, мананенасычаныя, поліненасычаныя, амега-3-ненасычаныя, амега-6-ненасычаныя, трансненасычаныя і кан'югаваныя тлустыя кіслоты. Уся гэтая разнастайнасць звязана з адным тыпам хімічных сувязяў. Іх прырода абумоўлівае ўсю розніцу паміж класамі тлушчаў.

Некаторыя прадукты ўтрымліваюць па некалькі тыпаў тлустых кіслот. Напрыклад, у курыных яйках — 11 працэнтаў тлушчаў, з іх 3 працэнты насычаных, 4—5 — мананенасычаных і 3—5 — поліненасычаных, вельмі мала трансненасычаных тлустых кіслот і кан'югаванай лінолевай кіслаты.

Наогул мы дрэнна ўяўляем тлушчы з хімічнага пункту гледжання і не разумеем, якія пераўтварэнні яны перажываюць у нашым арганізме. Напрыклад, распаўсюджана меркаванне аб тым, што з'едзеныя тлушчы адразу адкладваюцца ў нашым целе, на самай жа справе спачатку ім неабходна быць пераўтраўленымі ў кішэчніку, расшчапіцца і толькі пасля засвоіцца клеткамі. Большую частку тлушчаў арганізм накіроўвае на атрыманне энергіі, з дапамогай астатняй часткі будуюцца новыя структурныя элементы цела.

Праблемы, звязаныя з тлушчамі, абумоўлены іх вялікім энергаўтрыманнем. Таму відавочным спосабам пазбегнуць паўнаты застаецца меншае ўжыванне высокаэнергетычных прадуктаў. Аднак сярэднестатыстычны чалавек ужывае вельмі многа тлустай ежы — у яго штодзённым рацыёне каля 100 грамаў тлушчу (900 ккал), у той час як можна было б абысціся і 25 грамамі (225 ккал), што з'яўляецца сутачнай патрэбай арганізма ў тлушчах. З рознымі прадуктамі мы ўжываем тлушчы наступным чынам: 25 працэнтаў з мясам, 20 — з хлебабулачнымі вырабамі, 15 — з маслам для бутэрбродаў, 15 — з малаком, сырам і ёгуртамі, 10 — з агароднінай (пераважна з бульбянымі вырабамі), 5 — з рыбай, 5 — з арэхамі і соусамі і яшчэ 5 — з алеямі.

Ёсць дзве тлустыя кіслаты, якія абавязкова павінны ўваходзіць у склад ежы, яны яшчэ называюцца незаменнымі. Справа ў тым, што ў нашым арганізме могуць сінтэзавацца амаль усе віды патрэбных насычаных і мананенасычаных тлустых кіслот. Гэты сінтэз ажыццяўляецца з вуглевадародаў, спірту і нават з бялкоў. Але мы не можам утвараць амега-3 і амега-6 тлустыя кіслоты, хоць яны патрэбны нам для ўтварэння, напрыклад, арахідонавай кіслаты, якая з'яўляецца папярэдніцай многіх рэчываў, што бяруць удзел у рэалізацыі розных механізмаў абароны або ў рэакцыях мясцовага запалення, якія ўзнікаюць у адказ на рознага кшталту пашкоджанні. Некаторыя заходнія вучоныя сцвярджаюць, што тлустыя кіслоты, асабліва амега-3, здольны прадухіляць шэраг захворванняў: сардэчна-сасудзістыя, скурныя, алергічныя, заўчаснае старэнне, паводзінавыя праблемы ў дзяцей, некаторыя псіхічныя расстройствы, цукровы дыябет, артрыт і розныя формы раку.

Паверым у гэта і пачнём ужыванне тлустай рыбы — селядца, сардзін, макрэлі, ласося, фарэлі і шэрагу іншых. Будзем мець на ўвазе, што амега-3 тлустыя кіслоты ўтвараюцца ў водарасцях, далей... перадаюцца рыбе, з дапамогай якой і трапляюць у наш рацыён. Акрамя таго, вышэйпамянёныя кіслоты ўтрымліваюцца ў алеях і арэхах.

Што датычыцца трансненасычаных тлустых кіслот, якія з'ўляюцца, па сутнасці, пабочным эфектам гідрагенізацыі (працэсу, які дазваляе нам атрымліваць маргарыны, без якіх, як вядома, немагчымы выраб цэлага шэрагу прысмакаў), то, згодна з апошнімі амерыканскімі і брытанскімі даследаваннямі, гэтыя кіслоты не выклікаюць, як меркавалася раней, сардэчна-сасудзістых захворванняў. А доследы на жывёлах даказваюць адсутнасць іх уплыву на працягласць жыцця, рэпрадуктыўную функцыю і развіццё грызуноў. Больш за тое, утрыманне трансненасычаных тлустых кіслот у апошнія гады пастаянна зніжаецца. Сусветныя вытворцы мяккага маргарыну панізілі ўтрыманне трансненасычаных тлустых кіслот у сваім прадукце з 10 працэнтаў, як гэта было ў сярэдзіне 90-х мінулага стагоддзя, да 1 працэнта сёння.

Асаблівай увагі заслугоўвае кан'югаваная лінолевая кіслата. У апошні час з'явіліся даныя аб тым, што ўключэнне гэтага рэчыва ў дыету можа станоўча адбівацца на агульным стане чалавека. Ёсць нават спадзяванні на тое, што КЛК здольна папярэджваць рак малочнай залозы.

У нейкай колькасці КЛК ёсць нават у такіх прадуктах як ялавічына, бараніна, малако, вяршкі, масла, ёгурт і сыр, прычым у апошнім — у найбольшай колькасці. Нягледзячы на вельмі сціплае ўтрыманне кан'югаванай лінолевай кіслаты ў прадуктах, гэта рэчыва мае вялікае значэнне для нас. Мяркуецца, што яно валодае проціпухлінным эфектам, перашкаджае атэрасклератычнаму звужэнню сасудаў, актывізуе імунную сістэму, выступае ў ролі роставага фактара і спрыяе выслабаненню энергіі з тлушчавых дэпо, што было даказана на жывёлах.

**Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Пускавым момантам для праявы псарыязу можа быць стрэс

Сярод захворванняў скуры з працяглым хранічным цячэннем псарыяз займае другое месца пасля атапічнага дэрматыту. Немач можа пачацца ў любым узросце і часцей за ўсё схільнасць да яе перадаецца ў спадчыну дзецям, унукам, праз пакаленне, і па мужчынскай і па жаночай лініі. Дакладна сказаць, узнікне хвароба ці не, немагчыма. Чалавек можа быць носьбітам гэтага гена, а захворванне ў яго не праявіцца.

— Аднак, — адзначае ўрач-дэрматавенеролаг, загадчык амбулаторнага дэрматавенералагічнага аддзялення Мінскага скурвендыспансэра Уладзімір Яроміч, — пускавым момантам для праявы хваробы можа быць цяжкае захворванне або стрэс. Гэтая паталогія лечыцца, але яна здольная рэцыдаваць. Можна дабіцца таго, што скура ў чалавека стане практычна чыстай, а праз нейкі час ён, напрыклад, панервуецца і высыпкі вернуцца.

Паспяховае лячэнне ў многім залежыць не толькі ад урачоў і рэгулярнага дыспансэрнага назірання. Вялікая роля ў прафілактыцы абвастрэнняў псарыязу належыць ладу жыцця, правільнаму харчаванню, рэжыму сну і адпачынку, стараннаму догляду скуры.

Рацыён харчавання хворага павінен уключаць малочныя прадукты (у першую чаргу тварог, кефір), садавіну, агародніну, ягады, натуральныя сокі і алей. Абмежаваць варта жывёльныя тлушчы, соль, вострую ежу, шакалад, мёд, цукар, варэнне. Пажадана ўключыць у штодзённы рацыён адвар аўса (1 шклянка аблушчанага аўса заліваецца 5 шклянкамі вады, у духоўцы ці на слабым агні парыцца 3—4 гадзіны, потым адціскаецца ў гарачым выглядзе), прымаць па 1/2—3/4 цёплыя шклянкі нашча некалькі месяцаў запар.

У залежнасці ад сезоннасці абвастрэнняў адрозніваюць зімовую форму псарыязу, пры якой пагаршэнне адзначаецца ў халодны час года, і летнюю — высыпкі ў гэтых выпадках размяшчаюцца на твары і адкрытых участках скуры. Пры восеньска-зімовай форме ў верасні-лістападзе карысна правесці курс прафілактычнай тэрапіі пры дапамозе ўльтрафіялетавага апраменьвання, прымаць прэпараты вітамінаў групы В.

Здавён выкарыстоўваюцца для лячэння псарыязу лекавыя расліны — як унутр, так і вонкава (у складзе збораў для ваннаў і ў мазях). Вось некалькі збораў, якія можна выкарыстоўваць у хатніх умовах.

**ФІТАТЭРАПІЯ ПРЫ ПСАРЫЯЗЕ**

1. Падтыннік вялікі, трава — 1 частка, дзівасіл, корань — 2 часткі, бузіна чорная, кветкі — 1 частка, хвошч палявы, трава або лісце брусніц — 1 частка, святаяннік дзіркаваты, трава — 3 часткі.

*1 ст. лыжку сумесі з верхам заліць 1 шк. кіпеню, настойваць 12 гадзін, працадзіць. Даліць ваду да першапачатковага аб'ёму. Прымаць па 1/3 шклянкі за 20—30 хвілін да яды 3 разы на дзень на працягу 2—3 месяцаў. Пасля кожнага месяца лячэння — перапынак 7 дзён.*

2. Падтыннік вялікі, трава — 1 частка, фіялка трохколерная, трава — 2 часткі, дымянка аптэчная, трава — 2 часткі, падалешнік еўрапейскі, ліст — 1 частка, багун балотны — 1 частка. *Гатаваць і піць, як у першым выпадку.*

3. Падтыннік вялікі і фіялка трохколерная, трава.

*1 ст. лыжку сумесі з верхам заліць 1 шк. кіпеню. Настойваць 6 гадзін. Прымаць па адной шклянцы 2 разы на дзень пасля яды.*

4. Ваўчкі, трава — 3 часткі, святаяннік дзіркаваты, трава — 3 часткі, явар балотны, корань — 3 часткі, падтыннік вялікі, трава — 1 частка, дзівасіл высокі, корань — 2 часткі, кукурузныя рыльцы — 2 часткі, брусніцы, ліст — 2 часткі, бузіна чорная, ліст — 2 часткі. *Гатаваць і прымаць як у рэцэпце № 1.*

5. Крапіва двухдомная, трава — 50 г, рэпяшок, трава — 50 г, талакнянка, ліст — 50 г, падтыннік вялікі, трава — 25 г.

*2 ст. лыжкі збору заліць 500 мл кіпеню, кіпяціць 10 хвілін, настойваць 4 гадзіны. Прымаць па 100 мл 4 разы на дзень да яды.*

**ВАННЫ З ЛЕКАВЫХ РАСЛІН**

*1. Некалькі жменек здробненай травы мыльніку лекавага заліць халоднай вадой, настояць на працягу 1 гадзіны, пракіпяціць 10—15 хвілін — гэта порцыя для адной ванны. Тэмпература вады 37—38 С, заставацца ў вадзе 15—25 хвілін. На курс — 10—12 ваннаў праз дзень.*

*2. Крываўнік, трава. Гатаваць і выкарыстоўваць як і мыльнік.*

*3. Ваўчкі, трава. Гатаваць і выкарыстоўваць аналагічна папярэднім рэцэптам.*

Аднак перш чым прымяняць лекавыя расліны для лячэння псарыязу, трэба параіцца з доктарам. Бо аднаму такая працэдура можа прынесці карысць, а другому — шкоду.

**Вольга ШАЎКО.**


Фота БЕЛТА.

## СОК З БУРАКОЎ УТРЫМЛІВАЕ ЭФЕКТЫЎНЫ КАРДЫЯАБАРОННЫ ЭЛЕМЕНТ

**Згодна з даследаваннямі ўрачоў з Лонданскай школы медыцыны, ужыванне за дзень 200 мл соку з буракоў можа значна знізіць артэрыяльны ціск, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Дыетычны антыакісляльны нітрат у бураках служыць добрай абаронай ад сардэчна-сасудзістых захворванняў і пачатковых прымет гіпертаніі. Вынікі навуковага тэставання паказалі, што ціск зніжаўся ўжо на працягу гадзіны пасля выпітай шклянкі соку з буракоў і прыходзіў у норму праз 3—4 гадзіны.

Больш за чвэрць насельніцтва планеты з'яўляюцца гіпертонікамі, і, паводле ацэнак спецыялістаў, гэта лічба павялічыцца да 29 працэнтаў да 2025 года. Акрамя таго, гіпертанія выклікае прыкладна палову выпадкаў ішэміі і 75 працэнтаў сардэчных udараў. Выяўлены кардыяабаронны элемент у бураках можа стаць простым і натуральным спосабам змяншэння ўзроўню сардэчных захворванняў, лічаць брытанскія медыкі.

**Кар. БЕЛТА.**



Сямейны псіхолаг

Святлана Анішчанкава

# ВОСТРАЎ НАДЗЕІ

Жаданне жыць паўнацэнным жыццём прысутнічае ва ўсіх. Разуменне паўнацэннага — індывідуальна. Імкненне да індывідуальнага — спроба чалавека ажыццявіць мару. А мараць людзі ў большасці сваёй аб шчасці, здароўі і дастатку. З пакалення ў пакаленне пераходзяць да нас мары аб прынцах і прынцэсах, аб палацах і бестурботным жыцці, поўным любові. Казкі на ноч у дзяцінстве, расказы-былі аб цудах у юнацтве натуральна нараджаюць чаканне чароўнага шчасця ў шлюбны перыяд.

Але ў нейкі момант аказваецца, што ўсе прынцы і прынцэсы ўжо даўно пажаніліся паміж сабой. І тады мы, падбадзёраныя сваякамі і інстынктам прадаўжэння роду, не страчваючы надзеі, кідаемся ў вір абяцанага сямейнага шчасця, і з пачуццём выкананага абавязку чакаем, калі ж наша другая палавіна дакладна ўпішацца ў ідэал.

Час мінае, вось і першынец нарадзіўся, а «палавіна» ўсё тая ж, без змяненняў у лепшы бок, — не апраўдвае выпешчанай надзеі на ціхамірнае, шчаслівае і нябеднае існаванне. Расчараванне — першы «памочнік» у справе распаду сям'і. «Дарослыя дзеці» ўступаюць у жыццё, поўнае горычы ад нязбытых надзей. Іх маленькія дзеці непрыкметна растуць, набіраюцца вопыту і баяцца задаць адзінае пытанне, якое іх хвалюе: «Мама, а тата ад нас не сыдзе?».

Пачуццё расчаравання змяняецца пачуццём віны і новы «мячык для пін-понга» гатовы: ахоўная рэакцыя штурхае кволы парусьнік сям'і ў адкрытае мора ўзаемных абвінавачванняў, варожая каманда, не ўмеючы працаваць сумесна, топіць судначка. Адзінае сувязное звяно — дзеці, вельмі слабыя, каб своечасова ўбраць парусы і выратаваць грот-мачту ў буры крыўдаў і зняваг. Цудоўны парусьнік мары, надзей і шчаслівай будучыні тоне. Ніхто не захацеў або не змог сказаць у патрэбны момант: «Даруй».

Трэба пачынаць новае жыццё. У спадчыну ад старога застаўся шчымлівы боль і... дзеці — нявольны напамін аб няўдалай спробе пабудаваць ідэальнае жыццё. Доказ збою ў праграме, дзе ўсе павінны былі ўсё рабіць па плану: паспяховая кар'ера, цікавае жыццё, бязмежнае каханне... У рэальнасці ўсё да банальнага проста. «Палавінка» аказалася звычайным чалавекам, з добрымі і дрэннымі рысамі, якія не былі ўлічаны ў свой час пры планаванні цудоўнай будучыні. Аднак прызнавацца ў сваіх памылках не хочацца. З падвоенай сілай, поўнай агрэсіі і нянавісці, няўдачлівыя муж і жонка спрабуюць рэабілітаваць сябе ў вачах грамадскасці, якой няма ніякай справы да чужых праблем і няшчасця адной, асобна ўзятай сям'і. Дзеці становяцца нявольнымі закладнікамі «няўдалай праграмы» і нясуць непасільнае цяжар адказнасці за памылкі сваіх бацькоў. Маленькае любячае сэрца разрываецца на часткі ад перажыванняў за сваіх аднолькава любімых і неабходных бацькоў.

Аднак час мінае, а ўзаемныя абвінавачванні і крыўды павялічваюцца як снежны камяк і коцяцца, змятаючы ўсё на сваім шляху. Яны пагражаюць пахаваць пад сабой апошні астравок мірнай зямлі для адпачынку душы і надзеі. Дзіцячай надзеі на правільнае, неабходнае і раднаснае.

Правільнае — гэта калі тата і мама кахаюць адно аднаго.

Неабходнае — гэта калі мужчына і жанчына паважаюць адно аднаго.

Радаснае — гэта калі цябе любяць, паважаюць і выхоўваюць дастойным чалавекам.

Дзіцячае цярпенне — неабдымная даліна прыгажосці і надзеі. Унутраны свет дзіцяці цудоўны і багаты, дзякуючы пануючай у ім бескарыслівай любові. Сум у ім — рэдкі візіцёр, якога прыводзяць за руку дарослыя і які спрабуе адабраць у дзіцячай душы кавалачак радасці. Але душа дзіцячая ад гэтага крадзяжу не пацерпіць да пары. Трэба толькі зразумець, што дзіця расце, яно дае бацькам час разабрацца, і чакае, калі ж яны зразумеюць простую ісціну: «Дружыць больш прыемна, чым сварыцца!».

Не заўсёды існуе магчымасць склеіць разбітую сям'ю. Але навучыцца дружыць і падтрымліваць з былой палавінкай паўнацэнныя адносіны — выгадна, зручна і прыемна:

выгадна — таму што ў процілеглым выпадку пастаянна напружаныя нервы сур'ёзна падрываюць здароўе;

зручна — таму што ніхто не будзе любіць дзіця мацней чым родны бацька або маці, а значыць і клапаціцца аб ім;

прыемна — таму што сяброў у нашым жыцці з кожным днём усё менш, а сяброўская падтрымка заўсёды лепш за варожую агрэсію. Бо ніхто нікому нічога не павінен...

Сяброўскія, адкрытыя адносіны дадуць магчымасць кампенсаваць дэфіцыт зносінаў з дзіцем, навучаць яго ісці па жыцці прадуктыўна, пазбавяць ад «комплексу ахвяры».

У наш час інстытут шлюбу дэфармуецца, вынікам чаго з'яўляецца вялікая колькасць няпоўных сем'яў. На змену культу сям'і прыходзіць актыўная жыццёвая пазіцыя жанчын, рэалізацыя іх права на сацыяльную і фінансавую незалежнасць. Змяненні акцэнту ў шкале каштоўнасцяў у бок «матэрыяльныя» патрабуюць ад сучаснага мужчыны высокага ўзроўню даходаў. Каханне сёння саступае паняццю «поспех». Сучасныя маладыя людзі хочуць мець усё і адразу. Іх несфарміраваныя душы, якія, згодна з законам прыроды, прагнуць любові і пяшчоты, пашкоджваюцца ў звужаных рамках задавальнення сэксуальных і фінансавых жаданняў. Мы валодаем усімі магчымасцямі для паўнацэннага, гарманічнага жыцця, але не спраўляемся з рытмам, прадыктаваным грамадствам. Таму так часта малады, перспектыўны мужчына не можа задаволіць запыты сваёй маладой, прыгожай жонкі і адпраўляецца ў разрад адрынутых няўдачнікаў. А дзеці растуць, клапатліва ахоўваюць свой востраў надзеі, дзе жывуць любоў, разуменне і дараванне... Заключаны з прыродай мірны дагавор дзіцяці не дзейнічае, калі размова ідзе аб дарослых.

Вучыцца ў сваіх дзяцей у нас неяк не прынята, а шкада. Паназірайце за сваім малым: нядаўна крыўдзіўся і ўжо забыўся, усміхаецца, любіць, даруе, таму што ведае: мама і тата для яго самыя блізкія людзі. А дарослыя ўсё ваююць, усё спрабуюць высветліць, хто ж вінаваты. Не хочуць зразумець: у вайне паміж мужчынам і жанчынай — пераможцаў няма. А вось ахвяры ёсць — дзеці, якія аднолькава любяць маму і тату. На жаль, для многіх нават думка аб дружбе з «былым» падаецца немагчымай. Крыўда, параненае самалюбства, няўменне і нежаданне зразумець і прыняць звычайнага чалавека, засланяюць увесь свет, робяць сляпым і бездапаможным. Але варта стужку жыцця адматаць на пару гадоў назад, калі гэты ж самы чалавек быў цудоўным, каханым і разам з ім хацелася пражыць усё жыццё. Гэтыя ўспаміны, несумненна, схаваныя на дне душы, «пад сямю замкамі». Як хутка здаецца беднае любячае сэрца, калі хочацца новае футра, хочацца заставацца каралевай, якой дораць кветкі і кожны дзень заваёўваюць яе сэрца.

Памылка і збой праграмы заключаюцца ў прыпынку. Здараецца так, што прыгожая карцінка цудоўнай будучыні не дае магчымасці зрушыцца з месца. Сілы жыцця заканчваюцца, застаюцца мары, у якіх, засынаючы, паміраe каханне. Трэба ісці наперад, жыць, пастаянна ўсведамляючы змяненні, што адбываюцца з намі і вакол нас. Час нястрымных жаданняў змяняецца ўсведамленнем ісціны: жанчына — каханне, мужчына — жыццё. Прырода размеркавала ролі да з'яўлення нас на свет, падарыла ёй — прыгажосць, яму — мудрасць. Узамен патрабуе гармоніі — для будучых дзяцей.

Шчаслівае сямейнае жыццё — падарунак, які трэба заслужыць карпатлівай, штодзённай працай, збіраючы па крупінках пяшчоту, вернасць, цярпенне. Крохкі сасуд трэба захоўваць беражліва, нікому не давяраючы, асвятляючы цяплом свайго сэрца, каб перадаць потым у спадчыну сыну альбо дачцэ як каштоўны дар, які ўтрымлівае сэнс жыцця.

## POST factum

### КУР'ЁЗЫ МІНУЛАГА ГОДА

**Падводзячы вынікі года, прынята складаць агляд самых знакавых і важных падзей.**

Мы ж таксама вырашылі зрабіць нешта падобнае, але за аснову выбралі не значнасць пэўнага факта, а яго кур'ёзнасць і недарэчнасць.

### КОТ З КАШАЛЬКОМ

**Часам «сябры нашы меншыя» ўмудраюцца не толькі спарадзіраваць сваіх гаспадароў, але і скарыстацца правамі чалавека.**



Так, аўстралійскі кот па мянушцы Месія атрымаў сапраўдную банкаўскую картку і крэдыт на тры з лішнім тысячы амерыканскіх долараў выключна з-за няўважлівасці работнікаў банка. Гаспадыня ката хацела атрымаць другую картку, замацаваную за яе рахункам, і ўказала ў заяўцы імя свайго хатняга гадаванца.

Другому гаспадару, грамадзяніну Сербіі, пашанцавала значна менш. Тры яго свінні падпалілі хату. Яны ўлезлі ў акно, перакулілі тэлевізар, які загарэўся і стаў прычынай пажару.

Каза з Судана выйшла замуж за прадстаўніка віда homo sapiens пасля таго, як іх злавілі за заняткам сэксуальнага характару. Суданскія законы ў гэтым сэнсе строгія: «сапсаваў» дзеўку — ажаніся з ёй. Праўда, хутка пасля вяселля суданец аўдавеў.

### БЯДОВЫ МІЛЬЯНЕР

**Балонка па мянушцы Бяда (Trouble) сваім уласным прыкладам даказала справядлівасць дзвюх ісцін: па-першае, не ў грошах шчасце, па-другое, як вы яхту назавяце, так яна і паплыве.**

Чацвераногага бедалагу, якому гаспадыня пакінула ў спадчыну 12 млн долараў, праследуюць няўдачы. Спачатку брат памерлай гаспадыні адмовіўся клапаціцца аб Бядзе, потым хатняя работніца падала на сабаку ў суд за ўкусы. Нарэшце на імя сабакі пачалі прыходзіць пісьмы з пагрозамі, у якіх невядомы абяцаў забіць балонку і прысвоіць яе мільёны.

### ШЛЮБНАЯ ПАЛІТЫКА

**Мексіканскія заканатворцы ў 2007 годзе прынялі закон, паводле якога мужыкі могуць быць прыцягнуты да адказнасці за залішняе рвенне ці, наадварот, абыякавасць да сваёй жонкі.**

Іранскія заканатворцы паклапаціліся аб змяншэнні дашлюбных сэксуальных кантактаў моладзі. Яны прапанавалі заключаць часовыя шлюбы.

### ПІСУАР — НА ПАМЯЦЬ...

**...прыхапіў з паба жыхар Вялікабрытаніі. Мужчына выламаў прадмет у туалеце і вынес з сабой у рукзаку.**

У Японіі быў арыштаваны будаўнік, які краў жаночую бялізну. У яго калекцыі толькі трусікаў было знойдзена больш за 4 тысячы. Зноў жа ў Японіі з 10-га паверха атэля скралі залатую ванну-джакузі вагой 80 кг і коштам у 100 тысяч долараў.

### НЕПІСЬМЕННЫ ВЫКЛАДЧЫК...

**...17 гадоў выкладаў у амерыканскай сярэдняй школе. Паводле інфармацыі, змешчанай на сайце тэлеканала 10news.com, Джон Каркоран не ўмеў ні чытаць, ні пісаць. Яшчэ ў пачатковай школе Каркоран так і не здолеў асвоіць чытанне і пісьмо, аднак настаўнікі асобай увагі на гэта не звярталі — яны лічылі маленькага Каркорана дурненькім і проста пераводзілі з класа ў клас. У старэйшых класах хлопец сам пачаў выкручвацца, падманваць, прапускаць урокі, красці тэсты, падрабляць дакументы, каб схаваць сваю непісьменнасць. За што неаднаразова праводзіў час у кабінеце дырэктара.**

Бацькі, калі іх выклікалі ў школу, сцвярджалі, што ў іх сына няма складанасцяў з чытаннем і пісьмом, у хлопца проста псіхалагічныя праблемы. Нягледзячы ні на што, у 1956 годзе ён атрымаў дыплом аб заканчэнні школы.

— Я не мог ні чытаць, ні пісаць, — прызнаўся Каркоран, — аднак я мог «чытаць» саму сістэму і людзей. Каркоран працягнуў «вучобу» у адным з каледжаў Тэхаса, які скончыў у 1961 годзе, маючы ступень бакалаўра ў галіне адукацыі. Ён уладкаваўся ў каліфарнійскую сярэднюю школу, дзе і адпрацаваў 17 гадоў. Праўда, з узростам, яму стала няёмка за свой недахоп і крыўдна, што амерыканская сістэма адукацыі так і не змагла яго навучыць чытаць. У 48 гадоў Каркоран употай ад усіх запісаўся на курсы і праз год мог чытаць на ўзроўні шасцікласніка. Сёння ён адвакат, які спецыялізуецца на пытаннях адукацыі.

### СТУДЭНТ ЗАМЯНІЎ ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРА

**Паводле інфармацыі Reuters, заграбская газета Jutarnji list замест інтэрв'ю з прэм'ер-міністрам Харватыі Іва Санадэрам змясціла ад яго імя адказы аднаго харвацкага студэнта. Малады чалавек разыграў газету і па электроннай пошце адказваў рэдакцыі ад імя кіраўніка ўрада.**

Выдавец газеты Давор Буткавіч сказаў, што ён папярэдне звязваўся з прэм'ер-міністрам і той згадзіўся адказаць на пытанні журналіста па электроннай пошце. Тэмай размовы павінна была стаць інтэграцыя Харватыі ў Еўрапейскі саюз і НАТА.

Вось толькі Буткавіч памыліўся нумарам тэлефона і патрапіў на 23-гадовага студэнта факультэта журналістыкі, які даў адказы на ўсе пытанні. Прадстаўнікі пакрыўджанай газеты лічаць гэты факт не розыгрышам, а правакацыяй сваіх канкурэнтаў (малады чалавек з'яўляецца супрацоўнікам аднаго з такіх выданняў). Jutarnji list — адна з самых паважаных і аўтарытэтных газет Харватыі, яе тыраж 115 тысяч экземпляраў.

Забытае? Новае? Вечнае!

# РЫТУАЛЬНАЕ АДЗЕННЕ: дакрануўся і... «высах»

***«Памёр дзядуля, яго пераапранулі ў новы касцюм, але праз нейкі час бабуля апомнілася, што, аказваецца, дзеду «на смерць» падрыхтавалі зусім іншы касцюм. Бабуля была непахіснай — дзеда пераапранулі яшчэ раз, а той касцюм яна парвала на кавалкі і павесіла, <u>як анучы</u>, у хляве. Праз некалькі дзён бацька (зяць памерлага) нешта рабіў на падворку і вырашыў выцерці твар і рукі анучай з таго касцюма. З ім здарылася непапраўнае: ён літаральна на вачах пачаў страчваць вагу, «сохнуць». Ці мог той кавалак тканіны спраакаваць такія наступствы?»***

**Андрэй, студэнт з г. Брэста**

Кожнае новае пытанне нашых чытачоў сведчыць пра тое, што паводзіны нашых сучаснікаў у розных абрадавых сітуацыях бываюць часам настолькі непрадказальнымі, нелагічнымі і непрадуманымі, што ставяць у тупік не толькі развіццём далейшых падзей, але і неверагоднымі наступствамі. Самае складанае ў такіх выпадках тое, што людзі праз пэўны час пачынаюць разумець і разумеюць, што адбылося прынцыповае парушэнне традыцыі, якое, мякка кажучы, моцна псуе ім жыццё, і тады яны кідаюцца ва ўсе бакі свету, шукаючы паратунку. Але ці заўсёды можна знайсці лагічнае выйсце з той сітуацыі, якую чалавек стварыў сваімі нелагічнымі паводзінамі?

Адказ на прыведзенае пытанне і адначасова на пытанне, якое задала Ніна Іванаўна з Капыльскага раёна («Пясок з магілы да 40 дзён — кепскі, а што будзе, калі ім выпадкова абсыпаць чалавека?») трэба шукаць у шматлікіх рэгламентацыях, звязаных з пахавальна-памінальнымі абрадамі.

У адпаведнасці з народнымі светапогляднымі ўяўленнямі, за сваё жыццё чалавек нараджаўся/перанараджаўся і «паміраў» тры разы. Спачатку ён жыў ва ўлонні маці, затым развітаўся з «тым» светам і нарадзіўся ў «гэтым» свеце. Абрад вяселля павінен быў засведчыць рытуал «смерці» дзяўчыны і хлопца і адпаведна іх перанараджэнне ў статусе мужчыны і жанчыны або мужа і жонкі. Нарэшце, заключны этап у шэрагу трансфармацый — фізічная смерць і «пераход» нябожчыка ў «той» свет. Кожны з гэтых этапаў суправаджаўся абавязковым купаннем — мыццём — абмываннем вадой галоўных удзельнікаў абрадаў і падрыхтоўкай дзеля гэтых падзей зусім іншага — новага, спецыяльна падрыхтаванага — адзення. Прычым, як правіла, абрадавае адзенне, звязанае са статусным пераходам/перанараджэннем, выключалася з поля паўсядзённага карыстання — ім нельга было карыстацца ні ў якіх іншых абрадавых і пазаабрадавых сітуацыях. Адзенне нявесты хавалі ў куфар і маглі пакінуць «на смерць». Тое ж самае тычылася і адзення памерлага чалавека.

Акрамя таго, у поле абрадавых забарон і прадпісанняў траплялі многія прадметы, рэчы, атрыбуты, якія так ці інакш аказваліся ўключанымі ў пахавальна-памінальныя рытуалы беларусаў.

Даволі строгімі і лагічна абгрунтаванымі былі і рэгламентацыі, якія вызначалі паводзіны асноўных удзельнікаў гэтага вельмі складанага ў псіхалагічным плане абраду. <u>1) Пакуль ты не нарадзіў, не прадоўжыў свой род — за памінальны стол не садзіся. 2) Капаць магілу і апускаць туды труну з нябожчыкам мелі права мужчыны пасля 40 гадоў. 3) «Бабіць» або станавіцца бабкай-павітухай, а таксама мыць памерлага дазвалялася толькі тым жанчынам, якія ўжо самі не маглі нарадзіць дзіця.</u>

«Мёртвая» вада (якой мылі нябожчыка), як і многія іншыя рэчы, якія выкарыстоўвалі ў рытуалах пасляснмяротнага цыкла, на працягу 40 дзён працягваюць захоўваць энергетыку смерці, таму абавязкова трэба прасачыць, каб яе вылілі туды, дзе не будзе ступаць нага чалавека, ці свойскай жывёлы. **Трэба сцерагчыся і таго, каб частку гэтай вады не пакінулі для далейшага яе выкарыстання ў рытуалах чорнай магіі для нанясення людзям невылечных хвароб.**

<u>Мыла і ручнік, якімі карысталіся ў абрадзе абмывання сканалага, пажадана было закапаць або спаліць. У некаторых выпадках мыла пакідалі, каб выкарыстоўваць для «амярцвення» асобных хвароб: ім «лячылі» экзэму, псарыяз, іншыя скурныя захворванні.</u>

Адпаведным чынам ставіліся і да тых рэчаў, якія былі ў непасрэдным кантакце з чалавекам у момант яго смерці. <u>Часцей за ўсё нацельную бялізну (а то і ўсё адзенне), а таксама пасцельныя рэчы (прасціна, навалачка) спальвалі пасля пахавання.</u>

Дзесяткі разоў нам даводзілася чуць і пра тое, што людзі з-за няведання ў першую ж ноч пасля пахавання кладзіся спаць на той ложак (канапу, дыван), на якім памёр іх сваяк. Пасля гэтага ў іх пачыналіся праблемы са здароўем.

Разам з тым у абрадзе пахавання ёсць вельмі шмат тонкасцяў, пра якія не гавораць услых, але пра іх ведаюць асобныя людзі. Вось гэты аспект самы далікатны, супярэчлівы і непрадказальны. Напрыклад, <u>калі чалавек цяжка хварэе, ён прыходзіць адведаць памерлага, кладзе свае рукі на ногі нябожчыка і пра сябе кажа: «Ты анямеў, зрабі так, каб і мая хвароба анямела, забяры яе з сабой». Іншы варыянт «адкупіцца» ад цяжкай хваробы — прылегчы на некалькі хвілін на тое месца, дзе памёр чалавек (але гэта робіцца яшчэ ў той час, пакуль нябожчык ў хаце). Аднак гэтага пажадання трэба асцерагацца, бо той, у каго баліць спіна, крuціць ногі, пойдзе здаровым, а яго хваробы пяройдуць да таго, хто потым першым ляжа на той ложак.</u>

Якія механізмы энергаінфармацыйнай перакадзіроўкі ляжаць у аснове самога пахавальнага абраду і спадарожных яму рэчаў, пакуль што адказаць цяжка. Мы толькі асэнсоўваем праблему і выпрацоўваем розныя накірункі пошукаў. Ведаючы, што вада здольна структураваацца ў адпаведнасці з каналам інфармацыі і характарам яе агучвання (кожнае слова выклікае сваю амплітуду ваганняў, якая стварае той ці іншы малюнак крышталічнай рашоткі), мы вырашылі правесці эксперымент з «нежывым» прадметам, адным з галоўных атрыбутаў вясельнага і пахавальнага абрадаў — ручніком. У адным выпадку гэта быў ручнік, на якім стаяла маладая пад час вянчання, у другім — той, на якім труну з нябожчыкам апускалі ў магілу. Медная рамка, а затым і бронзавы маятнік далі зусім розны малюнак кругавых рухаў над тым месцам, дзе стаялі жаніх і нявеста, і над тым, на якім знаходзілася труна. Які энергетычны патэнцыял сканцэнтраваны ў адным ручніку і якая разбуральная сіла сфакусіравана ў другім кавалку самаробнай тканіны! На гэтым мы не супакоіліся і прадоўжылі эксперымент. Толькі на гэты раз аб'ектам даследавання сталі фатаздымкі вясельнай пары і фота чалавека, якога не стала за некалькі дзён да навуковага доследу. А далей у полі нашай ўвагі аказалася адзенне нявесты і адзенне, якое засталося пасля памерлага... Вынікі былі такімі ж.

З гэтага можна зрабіць высноў, што не толькі вада, у якой мылі нябожчыка, набыла зусім іншыя характарыстыкі, але і тое ж адзенне, ручнікі, ложак і ўсё астатняе, што так або інакш было звязана з нябожчыкам.

Яшчэ адно прадпісанне абрадавай практыкі беларусаў прымушае гаварыць пра вельмі глыбокія і моцныя стасункі паміж рознымі складнікамі пахавальнага абраду. Напрыклад, <u>катэгарычна забаранялася, каб у адзенні памерлага хоць фрагментарна прысутнічаў чырвоны колер, таму што ў адпаведнасці з народнымі ўяўленнямі гэта магло пацягнуць за сабой яшчэ адну смерць кроўнага сваяка.</u>

<u>Вымалёўваецца і асацыятыўны рад. Калі прысніцца сон, у якім зуб выпадае з крывёю, то меркавалі, што вельмі хутка памрэ нехта са сваякоў. І наадварот, калі жанчына гатавала велікодныя яйкі, то сярод многіх чырвоных адно заставалася белым — і гэта быў перакананаўчы знак смерці. У такім разе там, дзе ўсё белае (сёння часта пахавальны абрад суправаджаецца суцэльным чорным колерам), не павінна быць чырвонага. Адразу просіцца паралель: дзіця да сарака дзён спавіваюць ва ўсё белае, але зверху абавязкова перавязваюць чырвоным поясам.</u>

Атрымліваецца, што не толькі рэч сама па сабе, але яшчэ і форма, колер таксама здольны канцэнтраваць станоўчую або адмоўную інфармацыю. Відаць, тым больш гэта тычыцца рэчаў, што былі ў кантакце з дзіцем, якое насілі хрысціць у царкву. Верагодна, таму <u>нельга было перадаваць у спадчыну заручальныя пярсцёнкі заўчасна загінулых людзей, каб не справакаваць ланцуг далейшых непаразуменняў.</u>

Зразумела, што ў гэтым жа шэрагу прыкладаў стаіць і той, у якім гаворка ішла пра недаравальны кантакт бацькі студэнта з адзеннем, у якое пераапранулі памерлага дзеда. Каб не ўскладняць сітуацыю і надалей, таму чалавеку неадкладна трэба «пераплюсаваць» энергетыку свайго арганізма, надаць яму патэнцыял жыццестваральнасці. Для гэтага можна выкарыстаць купанне ў святых крыніцах, выліванне воску над галавой, нейкі час папіць ваду, прапушчаную праз заручальны пярсцёнак або праз адтуліну ў смаліне і многае іншае. Аднак заўсёды памятайце: праблему лепш прадухіліць, чым потым з ёю змагацца. Светлага вам настрою напярэдадні доўгачаканай вясны.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**


# БПС-БАНК

## «ОАО «БПС-Банк» устанавливает следующий ПОРЯДОК выпуска, обращения и погашения сберегательных сертификатов в ОАО «БПС-Банк»

*Порядок выпуска, обращения и погашения сберегательных сертификатов в ОАО «БПС-Банк» (далее – Порядок) разработан в соответствии с требованиями Банковского кодекса Республики Беларусь, Инструкции по выпуску, обращению и погашению депозитных и сберегательных сертификатов, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 27.12.2006 № 219, Инструкции по организации кассовой работы в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях Республики Беларусь, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 21.12.2006 № 211, Правила выполнения операций по вкладным (депозитным), текущим (расчетным) счетам физических лиц в ОАО «Белпромстройбанк» от 29.12.2005 № 01-05/228 и Правил выполнения операций со сберегательными сертификатами в ОАО «БПС-Банк» от 21.05.2007 № 01-05/84.*

*Настоящий Порядок регулирует порядок и условия выпуска, обращения и погашения сберегательных сертификатов в ОАО «БПС-Банк» (далее – Банк) и подлежит обязательному ознакомлению вкладчиков при покупке сертификата.*

*При изменении законодательства Республики Беларусь до внесения соответствующих изменений в настоящий Порядок, а также при рассмотрении вопросов, не нашедших отражения в настоящем Порядке, следует руководствоваться нормами законодательства Республики Беларусь, другими локальными нормативными правовыми актами ОАО «БПС-Банк».*

### 1. Общие положения

1.1. Подразделения Банка (Центр по обслуживанию клиентов, филиалы, отделения и их структурные подразделения (РКЦ, ЦБУ), отделения филиалов) осуществляют выпуск сберегательных сертификатов (далее – сертификаты) при наличии у Банка лицензии Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности с правом привлечения денежных средств физических лиц во вклады (депозиты) и выдачи ценных бумаг.

1.2. Сертификат – ценная бумага, удостоверяющая сумму депозита, внесенного в Банк, и права вкладчика (физического лица – держателя сертификата, за исключением индивидуального предпринимателя – держателя сертификата) на получение в Банке по истечении установленного срока суммы депозита и процентов по нему.

1.3. Сертификат является безусловным обязательством Банка вернуть сумму, внесенную в депозит, и выплатить причитающиеся проценты.

1.4. Владельцем сертификата может быть физическое лицо, как резидент, так и нерезидент Республики Беларусь, достигшее четырнадцатилетнего возраста.

1.5. Банк может выпускать срочные именные сертификаты и срочные сертификаты на предъявителя только в белорусских рублях и в документарной форме.

1.6. Бланки сертификатов и приложений к сертификату (далее – приложения) должны обладать определенной степенью защиты от подделки в соответствии с требованиями, предъявляемыми нормативными правовыми актами Министерства финансов Республики Беларусь.

1.7. Бланки сертификатов и приложений должны быть зарегистрированы в Государственном реестре бланков строгой отчетности Министерства финансов Республики Беларусь.

1.8. Сертификат является документальным оформлением договора банковского депозита.

1.9. Сертификат должен содержать следующие обязательные реквизиты:

наименование «сберегательный сертификат»;

серия и номер;

дата внесения депозита;

сумма депозита цифрами и прописью в белорусских рублях;

размер процентов по депозиту и периодичность их выплаты;

срок возврата депозита;

обязательство Банка вернуть сумму, внесенную в депозит, и выплатить причитающиеся проценты;

порядок возврата денежных средств вкладчику в случае неисполнения обязательства или досрочного расторжения договора, установленный уполномоченным органом Банка (допускается указание этих сведений в виде ссылки на источник опубликования настоящего Порядка);

ответственность Банка за неисполнение обязательства;

наименование и место нахождения Банка (место нахождения его постоянно действующего исполнительного органа);

фамилия, имя, отчество и паспортные данные вкладчика, если сертификат является именной ценной бумагой;

указание «на предъявителя», если сертификат является ценной бумагой на предъявителя;

подписи уполномоченных лиц подразделения Банка, скрепленные оттиском печати подразделения Банка для расчетно-кассовых и кредитных операций (далее – печать подразделения Банка);

отрывной талон (корешок).

1.10. Срок обращения сертификата, величина процентных ставок, минимальная (максимальная) сумма депозита, а также периодичность выплаты процентов устанавливается Генеральным директором Банка либо уполномоченным им лицом.

1.11. Банк не вправе изменять установленные при выпуске сертификата срок его обращения и размер процентной ставки.

По сертификату не может быть установлена нулевая процентная ставка.

1.12. Сертификат не может быть расчетным или платежным средством за товары (работы, услуги), за исключением услуг, оказываемых Банком.

1.13. Сделки с сертификатами совершаются только в белорусских рублях.

1.14. Операции в безналичном порядке по покупке, выплате процентного дохода и оплате сертификата осуществляются только с использованием счетов вкладчика (владельца сертификата) и в том подразделении Банка, где открыт счет вкладчика (владельца сертификата), с которого будет производиться списание средств либо их зачисление.

1.15. Досрочное расторжение договора осуществляется в подразделении Банка, продавшем сертификат.

### 2. Выпуск сертификатов

2.1. При покупке сертификата вкладчик должен быть ознакомлен с настоящим Порядком.

2.2. Для приобретения сертификата вкладчик размещает денежные средства на счете Банка по учету выпущенных сертификатов в одном из подразделений Банка при предъявлении документа, удостоверяющего личность, наличными денежными средствами и в безналичном порядке.

2.3. Приобретение сертификата на предъявителя за наличные денежные средства осуществляется вкладчиком без предъявления документа, удостоверяющего личность, за исключением случаев, предусмотренных Законом Республики Беларусь от 19.07.2000 № 426-З «О мерах по предотвращению легализации доходов, полученных незаконным путем, и финансирования террористической деятельности».

2.4. В подтверждение сумм, принятых наличными денежными средствами, вкладчику выдается второй экземпляр приходного кассового ордера, подписанный уполномоченными лицами подразделения Банка и заверенный печатью кассы.

2.5. Приобретение сертификата в безналичном порядке производится на основании платежного поручения вкладчика. В подтверждение зачисления денежных средств на счет Банка по учету выпущенных сертификатов вкладчику выдается копия платежного поручения, подписанная уполномоченными лицами подразделения Банка и заверенная штампом подразделения Банка.

2.6. Банк выдает вкладчику или его представителю сертификат, оформленный днем зачисления денежных средств вкладчика в полном объеме на счет Банка по учету выпущенных сертификатов.

2.7. По сертификатам, выпущенным 29, 30 и 31 числа на срок, исчисляемый месяцам, сроком возврата депозита в месяцах, имеющих меньшее количество дней, считается последний день такого месяца.

2.8. При выписке сертификата заполняются все реквизиты бланка сертификата и его отрывного талона (корешка). Если какой-либо из реквизитов не заполнен, сертификат считается недействительным.

2.9. Бланк сертификата заполняется с применением оргтехники или от руки чернилами.

2.10. Поправки и помарки при заполнении сертификата и приложений к нему не допускаются.

2.11. Сумма депозита в сертификате указывается цифрами и прописью. В случае расхождения в обозначении суммы прописью и цифрами действительной считается сумма прописью. При расхождении суммы прописью и цифрами в случае возможности достоверно установить фактически внесенную в Банк сумму с согласия владельца сертификата ему выплачивается фактически внесенная сумма. Оплата сертификатов с указанными расхождениями производится в подразделении Банка, выпустившем данный сертификат.

2.12. Сертификат должен быть подписан собственноручно уполномоченным лицом подразделения Банка, или посредством факсимильного воспроизведения подписи данного лица с помощью средств механического или иного копирования либо иного аналога собственноручной подписи и скреплен оттиском печати подразделения Банка.

2.13. Отрывной талон (корешок) подписывается вкладчиком или его представителем в подтверждение того, что он ознакомлен с настоящим Порядком и ему вручен сертификат.

При выдаче сертификата вкладчику отрывной корешок отделяется от основного бланка сертификата и остается в Банке.

2.14. Вкладчик имеет право оформлять по именному сертификату доверенности и завещательные распоряжения. Совершение операций представителями владельца сертификата по доверенностям, его наследниками производится в подразделении, выпустившим данный сертификат.

### 3. Передача прав по сертификату

3.1. Права, удостоверенные сертификатом, могут быть переданы только физическому лицу.

3.2. Уступка требования по сертификату может быть совершена только до наступления срока возврата депозита, предусмотренного в сертификате.

3.3. Стоимость, по которой передается сертификат при уступке требования, устанавливается соглашением сторон.

3.4. Для передачи другому лицу прав, удостоверенных сертификатом на предъявителя, достаточно вручения сертификата этому лицу.

3.5. Права, удостоверенные именным сертификатом, передаются в порядке, установленном для уступки требования (цессии). При уступке требования (цессии) одна сторона – владелец сертификата (цедент) уступает, а другая сторона (цессионарий) приобретает права по сертификату.

3.6. Уступка требования (цессия) при передаче прав по именному сертификату оформляется на оборотной стороне бланка сертификата.

3.7. Каждая уступка требования нумеруется лицом, уступающим права по сертификату (цедентом).

3.8. Уступка требования по сертификату подписывается обеими сторонами или их представителями.

3.9. Условие непрерывности оформления цессии является обязательным.

3.10. Внесение исправлений в договор уступки требования по именному сертификату осуществляется в подразделении Банка, выдавшем сертификат, с проставлением даты исправления, заверяется собственноручными подписями цедента, цессионария и уполномоченного лица подразделения Банка и скрепляется оттиском печати подразделения Банка.

3.11. В случае, когда передаточные надписи не умещаются на оборотной стороне сертификата, договор уступки требования может оформляться на приложении, выдаваемом в подразделении Банка, выписавшем сертификат.

3.12. Приложения выдаются владельцам именных сертификатов по их требованию при предъявлении ими документа, удостоверяющего личность, сертификата и всех имеющихся у него приложений в случае, если предыдущее приложение заполнено полностью.

3.13. До оформления приложения Банком проверяется подлинность представленного сертификата, соблюдение непрерывности ряда договоров уступки требования, полномочия лица, предъявившего сертификат в подразделение Банка.

3.14. Приложения являются неотъемлемой частью сертификата, должны быть пронумерованы Банком и содержать надпись: «Приложение № ______ к сберегательному сертификату серии БПСБ № _____________».

3.15. На бланке сертификата Банком делается отметка о выдаче приложения, которая скрепляется подписью уполномоченного лица и оттиском печати подразделения Банка.

### 4. Порядок выплаты процентов

4.1. Выплата процентов производится наличными денежными средствами либо в безналичном порядке при предъявлении сертификата.

Выплаты в безналичном порядке и по именному сертификату производятся при предъявлении документа, удостоверяющего личность владельца сертификата.

4.2. Безналичное перечисление денежных средств осуществляется на основании платежного поручения владельца сертификата. В подтверждение зачисления денежных средств на счет владельца сертификата ему выдается копия платежного поручения, подписанная уполномоченными лицами подразделения Банка и заверенная штампом подразделения Банка.

4.3. О выплате процентного дохода подразделением Банка делается отметка на бланке сертификата.

4.4. Проценты по сертификату начисляются со дня поступления денежных средств в подразделение Банка по день, предшествующий дню фактического погашения сертификата в пределах срока обращения сертификата, установленного при его выпуске, за каждый календарный день года, исходя из фактического количества дней в году (365 или 366).

По сертификату с пропущенным сроком погашения, начиная с указанной в сертификате даты возврата депозита, проценты не начисляются.

4.5. Выплата процентов может осуществляться ежемесячно, ежеквартально, раз в полугодие, ежегодно либо одновременно с погашением сертификата. Периодичность выплаты процентов указывается в сертификате.

4.6. При выплате процентов с периодичностью, установленной пунктом 4.5 настоящего Порядка, выплата процентов производится, соответственно, один раз в месяц, квартал, полугодие либо год в день истечения указанных расчетных периодов, соответствующий дате внесения средств вкладчиком в полном объеме на счет Банка по учету выпущенных сертификатов.

4.7. По сертификатам, выпущенным 29, 30 и 31 числа, днем выплаты процентов в месяцах, имеющих меньшее количество дней, считается последний день такого месяца.

4.8. В случае если срок выплаты процентов совпадает с выходным или праздничным днем, то выплата процентов производится в первый рабочий день, следующий за ним, с начислением процентов за соответствующий расчетный период.

4.9. При досрочном расторжении договора причитающиеся проценты пересчитываются по ставке текущих счетов физических лиц, действующей на дату погашения сертификата. Излишне выплаченные проценты удерживаются из суммы депозита.

4.10. Владелец сертификата обязан вернуть излишне выплаченный ему в результате технической ошибки процентный доход.

### 5. Порядок восстановления прав по утраченным сертификатам

5.1. Восстановление прав по утраченным сертификатам на предъявителя осуществляется судом в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

5.2. В случае утраты именного сертификата законный владелец вправе обратиться в подразделение Банка, выдавшее сертификат, с письменным заявлением об утрате сертификата и с просьбой о выдаче дубликата.

С данным заявлением и документом, удостоверяющим личность, а также имеющимися документами, подтверждающими права заявителя по утраченному сертификату, заявитель обращается к работнику подразделения Банка, осуществляющему операции с сертификатами.

5.3. Рассмотрение заявления о выдаче дубликата именного сертификата осуществляется в течение трех банковских дней. На период до окончания рассмотрения заявления устанавливается запрет на осуществление операций по утраченному сертификату.

5.4. При наличии в документах, находящихся в подразделении Банка и представленных заявителем, оснований квалифицировать заявителя как законного владельца утраченного сертификата выдается дубликат сертификата.

5.5. Оплата услуг Банка по выдаче дубликата сертификата производится владельцем сертификата в соответствии с действующим на день получения дубликата Сборником вознаграждений (платы) за операции, осуществляемые ОАО «БПС-Банк».

5.6. Дубликат оформляется на новом бланке сертификата с проставлением отметки: «Дубликат сберегательного сертификата серии БПСБ № ________» и заполнением реквизитов в соответствии с реквизитами первоначально выданного сертификата.

В случае, если права по утраченному именному сертификату передавались с оформлением договора уступки требования, то фамилия, имя, отчество и реквизиты документа, удостоверяющего личность вкладчика, заполняются с указанием данных последнего владельца сертификата.

В дальнейшем Банк принимает к оплате дубликат сертификата.

5.7. Если подразделение Банка не имеет возможности на основании имеющихся документов достоверно убедиться в том, что заявитель является законным владельцем утраченного именного сертификата, Банк вправе отказать заявителю в выдаче дубликата.

Заявитель может обжаловать отказ Банка в судебном порядке.

### 6. Порядок оплаты сертификата

6.1. Оплата сертификата при наступлении срока его погашения либо при досрочном расторжении договора осуществляется по первому требованию его владельца при предъявлении сертификата, а также документа, удостоверяющего личность владельца, при погашении именного сертификата.

6.2. После проверки полномочий лица, предъявившего сертификат к погашению, непрерывности ряда договоров уступки требования по именному сертификату, при отсутствии претензий к предъявленному сертификату производится его погашение (оплата).

6.3. Оплата сертификата может осуществляться наличными денежными средствами и в безналичном порядке.

Безналичное перечисление денежных средств осуществляется на основании платежного поручения владельца сертификата при предъявлении документа, удостоверяющего личность. В подтверждение зачисления денежных средств на счет владельца сертификата ему выдается копия платежного поручения, подписанная уполномоченными лицами подразделения Банка и заверенная штампом подразделения Банка.

6.4. В случае выявления сертификатов, имеющих явные признаки подделки или подлинность которых вызывает сомнения, подразделение Банка вызывает территориальные органы внутренних дел. При этом сертификат не подлежит возврату владельцу до окончания его проверки органами внутренних дел.

6.5. При предъявлении в подразделение Банка именного сертификата, считавшегося утраченным, составляется в двух экземплярах заключение о невозможности его оплаты, один из которых выдается на руки предъявителю сертификата вместе с оригиналом предъявленного сертификата.

Предъявитель именного сертификата имеет право в судебном порядке истребовать от владельца дубликата сертификата уплаченную ему сумму либо доказывать свои права на невостребованные в Банке средства сертификата.

6.6. В случае нарушения непрерывности ряда договоров уступки требования по именному сертификату составляется в 2-х экземплярах заключение об отказе в погашении сертификата. Именной сертификат вместе с одним экземпляром заключения возвращается его владельцу (держателю).

Погашение сертификата в данном случае производится после восстановления владельцем (держателем) именного сертификата последовательности договоров уступки требования.

6.7. При невозможности восстановления последовательности договоров уступки требования Банк вправе произвести платеж последнему до момента перерыва в ряде договоров уступки требования владельцу сертификата в соответствии с отметками на оборотной стороне сертификата или на дополнительных листах к нему.

6.8. Частичное погашение сертификата не допускается.

6.9. В случае, если срок погашения сертификата совпадает с выходным или праздничным днем, то погашение сертификата производится в первый рабочий день, следующий за ним.

6.10. За несвоевременный возврат средств или выплату процентов владельцу сертификата выплачивается пеня в размере 0,03 процента от несвоевременно выплаченной суммы за каждый день просрочки.

6.11. В случае неисполнения Банком обязательств по возврату денежных средств и начисленных по сертификату процентов возврат депозита с причитающимися процентами осуществляется в соответствии с постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 29.03.2001 № 75 «Об утверждении правил гарантирования возврата привлекаемых банками средств физических лиц».

### 7. Залог сертификата

7.1. В качестве обеспечения исполнения обязательств по кредитам, выданным в белорусских рублях и иностранной валюте, подразделения Банка имеет право принимать в залог сертификаты кредитополучателя и (или) иных физических лиц. В залог могут приниматься только сертификаты, выпущенные ОАО «БПС-Банк».

7.2. Порядок работы Банка при приеме сертификатов в качестве обеспечения исполнения обязательств по кредитам регламентируется отдельным локальным нормативным правовым актом ОАО «БПС-Банк».

*Утвержден Генеральным директором ОАО «БПС-Банк» 01.08.2008 г. № 01-05/125*

*Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении открытого акционерного Общества «Белпромстройбанк» или по телефону в Минске 289 46 06.*

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 11.07.2007 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673*

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




## Чыгунка ўводзіць новыя цягнікі і маршруты

Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства транспарту і камунікацый, уведзены цягнікі № 495/496 Віцебск — Магілёў — Гомель — Еўпаторыя, якія будуць ажыццяўляць паездкі адзін раз у чатыры дні ў летні перыяд, № 58/57 Гродна — Санкт-Пецярбург (тры разы на тыдзень), № 848/847 Гомель — Бранск (саставам дызель-цягніка тры разы на тыдзень круглы год), № 64/63 Мінск — Іркуцк (два разы на тыдзень, замест раза на тыдзень, у круглагадовым курсіраванні), № 305/306 Магілёў — Вільнюс (тры разы на тыдзень) і № 428/427 Гомель — Мурманск (адзін раз на тыдзень у летні перыяд). Плануецца ўвесці прычапныя вагоны: другі вагон Мінск — Астана (два разы на тыдзень), вагоны Гродна — Адлер (праз дзень), Магілёў — Адлер (праз дзень), Гродна — Адэса (адзін раз у чатыры дні).

**БЕЛТА.**

### ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**СКАНВОРД + СУДОКУ (14 лютага). Па гарызанталі:** Штанга. Пікнік. Хлор. Этна. Пул. Яга. Ігла. Радно. Тэрмапара. Сан. Тля. Правата. Агра. Дата. Храп. Аналаг. Табу. Леў. Амак. Скат. Ката. Вар. Капялюш. **Па вертыкалі:** Стапа. Ленчык. Талія. Гарбатаў. Нерпа. Асада. Ствол. Арэлі. Паталок. Граната. Апрош. Пенал. Агат. Арат. Лахтак. Дыяграма. Рабат. Капюшон. Апука.

*Адказы на судоку гл. у табліцы.*

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 8 | 3 | 6 | 4 | 5 | 7 | 2 | 1 | 9 |
| 2 | 5 | 9 | 6 | 1 | 8 | 7 | 4 | 3 |
| 7 | 1 | 4 | 9 | 3 | 2 | 6 | 5 | 8 |
| 9 | 4 | 7 | 2 | 8 | 5 | 1 | 3 | 6 |
| 1 | 6 | 5 | 7 | 4 | 3 | 8 | 9 | 2 |
| 3 | 8 | 2 | 1 | 6 | 9 | 5 | 7 | 4 |
| 5 | 2 | 1 | 3 | 9 | 6 | 4 | 8 | 7 |
| 6 | 9 | 8 | 5 | 7 | 4 | 3 | 2 | 1 |
| 4 | 7 | 3 | 8 | 2 | 1 | 9 | 6 | 5 |

**ОАО «Минскгрузавтотранс» извещает своих акционеров о проведении 19 марта 2008 года очередного собрания акционеров**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2007 году и основных направлениях деятельности Общества на 2008 год.
2. Отчет о работе наблюдательного совета Общества в отчетном периоде.
3. О результатах проверки аудитором и ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2007 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества за 2007 год.
5. О распределении чистой прибыли и выплате дивидендов за 2007 год, утверждение направлений использования чистой прибыли на 2008 год.
6. Установление размера материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии, избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

**Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 2 (2 этаж, к. 1). Начало собрания в 14.00.**

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 2, комн. 37) в рабочие дни в период с 10 по 18 марта 2008 года с 8.30 до 13.30, а в день проведения собрания — в помещении, где оно проводится.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 13.00 до 13.45 в день и по месту проведения собрания — по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителей акционеров — и доверенности.

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании данных реестра акционеров по состоянию на 01 января 2008 года.

**Справки по тел. (8 017) 222 98 09.**

*Наблюдательный совет ОАО «Минскгрузавтотранс».*

УНН 100028545

Газетны серыял «Жанацікі»

# ...НЯХАЙ ГАВОРАЦЬ!

**Хто б ведаў, што ў сямейнае жыццё могуць уварвацца надакучлівыя «спадарожнікі» — плёткі і чуткі. І каму яны патрэбны, і хто іх ставарае? Таямніца, пакрытая цемрай. Як змагацца з плёткамі аб сабе, маладыя вырашалі на сямейным сходзе. На дапамогу прыйшоў нават кот Марцін...**

Дыялог паміж мной і жонкай, 22.00, пятніца:

— Ведаеш, што ты ажаніўся па разліку?

— Я? На кім? У сэнсе, навошта??

— На мне, на кім жа яшчэ.

— *(Паўза).* А па якім разліку?

— Яшчэ дакладна не вызначана, спытай у (прозвішча).

Можна горача, і, натуральна, не без азарту абмяркоўваць апошнюю навіну з сямейнага жыцця сяброў, якую данеслі, хто б сумняваўся, «з першых вуснаў». Пікантным падрабязнасцям, колькі пазашлюбных дзяцей, пакуль жонка адпачывала на курорце, паспеў «зрабіць» твой добры знаёмы (і грошай не пашкадаваў, змей гэтакі, набыў сваёй палавіне на ўсе тры тыдні пуцёўку як мага далей, у Фінляндыю, на лыжах у горы, каб яна там яшчэ і нагу зламала, а ён тут будзе з малодкамі мілавацца), наогул не вельмі верыш. І зла яму не жадаеш, і не зайздросціш, і спачуваеш... Але ўсё роўна думаецца — дыму без агню не бывае. Сапраўды, што за дзяўчынка з ім вярталася апоўначы? Вельмі, вельмі цікава. Увогуле, і з жонкай ён ужо даўно разам не выходзіць, неяк асобна яны — і на работу, і з работы.

Можна абсмоктваць прыватнае жыццё нават незнаёмага, і пры гэтым быць цалкам упэўненым, што пра тваю сям'ю ніхто-нічога-ніколі. Бо ў іншых — па-іншаму, а ты з жонкай, вядома, эталон маральнасці, з рэпутацыяй, больш празрыстай і не бывае. Дык вось, спадарства, не так гэта. Чуткі і вас нагоняць, дзе б вы ні знаходзіліся. Я, напрыклад, у гэты час быў у аўтобусе, у якім і сустрэў, стоячы ў гумовым «гармоніку», калегу па цэху. У сэнсе, журналісцкага.

Не бачыліся мы даўно, таму вырашылі працягнуць размову ў кафэ. Цікава, безумоўна, даведацца аб тым, як можа змяніцца жыццё чалавека за год, але яшчэ большы інтарэс выклікалі яе не зусім да месца пытанні. Пасля таго як «ты ж мяне ведаеш, я ніколі не буду нагаворваць, але тут чула... Вядома ж, гэта няпраўда, але ты павінен мець уяўленне пра тое, што...» пачуў я плётку пра сябе і жонку. «Вось ён, сюжэт для новай серыі «Жанацікаў», — падумалася. Але сам змест чуткі-плёткі можна было б выдумаць і больш неверагодны. Усё ж такі большасць агульных знаёмых не два класы царкоўнапрыходскай школы скончылі, фантазія прысутнічае, а гэтыя палюбоўнікі-палюбоўніцы надакучылі, трэба ствараць што-небудзь новенькае. Крызіс жанру, напэўна! Трэба падкінуць нейкую інфармацыю для далейшага разважання, падумалася, раз такая справа. Няхай усе лічаць, напрыклад, што я сын арабскага шэйха і гарэм трымаю.

...Прыйшоўшы дадому, я першнаперш расказаў жонцы пра сустрэчу з Лілечкай. Ці мала што — можа, прыпішуць мне паход з незнаёмай невядомкай. Прабачце, з невядомай паненкай, зразумела з якой мэтай. Няхай хоць Ганначка мая будзе ведаць, што і як сапраўды адбываецца.

І, што крыўдна, паводле назіранняў, чуткі прасочваюцца як вірус грыпу ці нават імунадэфіцыту амаль у кожную сям'ю. Здаецца і мы, і ўсе навакольныя — людзі як людзі, не лепш і не горш за іншых. Але абавязкова знойдзецца добразычлівец, які складзе такую байку, што Іван Крылоў плакаў бы ад зайздрасці.

Тэрмінова мы правялі сямейны сход, зразумела ж, з непасрэдным удзелам нашага ката Марцыпана. Дарэчы, мы пра яго зусім забыліся ў мінулых артыкулах. Дакладваю вам, шаноўныя, што зараз па неадкладных кацянячых справах у яго прыватных апартаментах (гэта значыць, у нашай кватэры) гасцюе каханая — кошачка Фея. Таму ў іх на некаторы час таксама створана свая ўласная сям'я. А надзённыя пытанні Марціну і Феі заўсёды цікавыя. І ў выніку сумеснай нарады, якая прайшла, як прынята было казаць калісьці, «на высокім узроўні, канструктыўна, у атмасферы ўзаемапаразумення», наша ячэйка грамадства выпрацавала правілы паводзінаў. Такія вось унутраныя, сямейныя, карпаратыўныя. Яны вельмі простыя, складаюцца роўна з аднаго пункта. Цяпер на ўсе падспудныя пытанні, намёкі, паведамленні знаўцаў і сведак нашага прыватнага жыцця мы адказваем: «Так, абсалютная праўда. Усё так і было, ну, вядома ж». Бо апраўдвацца няма сэнсу, ды і навошта? Нават пачалі праводзіць эксперымент. Пасля «пацвярджэння» чарговых гісторый, у «добрых знаёмых» на твары з'яўляецца расчараванне, а ў голасе — злосць і нават крыўда. Быццам бы зламалі іх любімую цацку, хоць прабачэння за гэта прасі. Больш сумленным людзям становіцца потым сорамна за тое, што намагаліся нам «расплюшчыць вочы», і з гэтага часу яны не тэлефануюць. Ды і нам не вельмі хочацца мець з такімі добразычліўцамі ніякіх зносінаў.

Але гэта правіла дзейнічае, калі муж і жонка адчуваюць цалкам давер адно да аднаго. Тады плёткі і намовы ніколі не атруцяць жыццё. А вось як толькі закрадаецца сумненне ў чысціні і шчырасці адносінаў, то адразу ж і сустракаюцца паслужлівыя мяхі з гісторыямі. А яшчэ мы пачалі складаць калекцыю плётак пра сябе. Не вельмі яна вялікая, спадзяюся, такой і застанецца. Раскажу толькі апошнюю байку. Мая Ганначка вельмі любіць карыстацца прыгожымі, незвычайнымі па знешнім выглядзе канцылярскімі дробязямі кшталту нататніка, алоўка, сашчэпкі. Ну, як і ўсе дзяўчынкі. Карацей, аднойчы прынёс ёй ручку, якой на паперы пішуць. Такую ў бізнэсменаў звычайна прынята дарыць кіраўнікам буйной кампаніі ў якасці сувеніра, у знак павагі, любові і каб паказаць, што вельмі цэніш мудрасць ягонага кіраўніцтва. Маўляў, не аўтамабіль, вядома ж, так, каштоўная дробязь, па якой адразу зразумела, што гаспадару ручкі і аўтамабіль за проста так могуць падарыць. Таксама ў знак павагі. Ну, а я сваёй жонцы ручку такую нават не падарыў, а проста даў. Трэба ж ёй чымсьці пісаць, ды і прыемнае хацелася зрабіць. І вось, праз тыдзень прыходзіць яна з працы, і кажа:

— Паглядзелі на гэтую няшчасную ручку мае знаёмыя, і разам пазначылі, што ў мяне завёўся іншы мужчына. Я не зразумела, чаму. І ведаеш, што адказалі? Што ў мяне ручка дарагая з'явілася! Я здзівілася, дык гэта ж Дзіма падарыў. А яны смяюцца — такія падарункі толькі палюбоўнік робіць, мы сваім жонкам — ніколі. І жонкі сядзяць насупраць і ківаюць: так, такія шырокія жэсты толькі кавалер можа рабіць. Праз гадзіну аб гэтай ручцы ведала ўсё зацікаўленае асяроддзе.

Вось так і нараджаюцца плёткі. Ну што тут можна адказаць? Няхай гавораць!

**Дзмітрый АЛЬФЕР.**

***Наш сённяшні эксперт — Мікалай ХАДАСЕВІЧ, вядучы праграмы «Сталічны футбол» на тэлеканале СТБ:***

*— На плёткі, чуткі ў свой бок не рэагую, таму што гэта выключна плён уяўлення староннiх людзей, і мяне гэта не датычыцца. Плётак пра мяне ходзіць няшмат, можа, таму, што не даю падставаў, ці няма каму даносіць гэтыя чуткі да мяне, або наконт маёй сціплай персоны не гавораць.*

*А ўвогуле, у Сяргея Даўлатава сустракаецца вельмі карысная думка аб тым, што няма розніцы, што пішуць ці гавораць аб чалавеку, галоўнае, каб пра яго пісалі і гаварылі.*

## ЗА СЯСТРУ — У КПЗ

**Спроба грамадзянкі Манголіі прайсці беларускі пагранкантроль па пашпарту сястры не ўвянчаліся поспехам, паведамілі ў Дзяржаўным пагранічным камітэце Беларусі.**

Пры афармленні цягніка накірункам «Масква — Прага» ў пункце пропуску «Брэст» грамадзянка Манголіі прад'явіла пагранічнаму нараду нацыянальны дакумент на чужое імя. Пасля высветлілася, што нелегальна перасячы мяжу жанчына спрабавала па пашпарту сваёй сястры. Тая, у сваю чаргу (паводле слоў затрыманай), знайшла працу ў Чэхіі і збіралася выехаць туды ў пошуках лепшых умоў жыцця, аднак у апошні момант захварэла. На сямейнай нарадзе было вырашана не адмаўляцца ад магчымасці, якая з'явілася, і адправіць на заробкі сястру.

Як менавіта беларускія вартавыя мяжы раскрылі сапраўдны твар затрыманай, у Дзяржпагранкамітэце не паведамляюць. Паводле слоў начальніка прэс-цэнтра Аляксандра Цішчанкі: «У нас ёсць свае прафесійныя сакрэты. Былі выпадкі, калі памежнікі выкрывалі нават блізнят».

**Уладзімір МАЦВЕЕЎ, БЕЛТА.**

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

# Блізняты могуць разлічваць на поспех, а Шалі — прадэманстраваць свае лепшыя якасці



**АВЕН**. Перыяд прынясе зносіны з цікавымі людзьмі. Жыццё праявіцца рознымі фарбамі. Работы будзе многа. Не імкніцеся зрабіць усё адразу — лепш не дапускайце памылак. Можа спатрэбіцца творчая імправізацыя, пунктуальнасць і сабранасць, і поспех не абыдзе бокам.

**ЦЯЛЕЦ**. Вас можа чакаць творчы ўздым і, як вынік, нечакана ўдалыя вырашэнні праблемных задач, якія патрабуюць узгаднення з начальствам. Давядзецца даказваць ваш высокі прафесіяналізм. Пачатак тыдня — удалы час для рэалізацыі планаў і задумаў. Пажадана, каб эмоцыі не былі перашкодай у вашай дзейнасці. Раскрываючы свой творчы патэнцыял, атрымаеце магчымасць умацаваць аўтарытэт, можа з'явіцца шанц заняць больш высокую пасаду.

**БЛІЗНЯТЫ**. З'явіцца магчымасць дабіцца поспеху адразу ў двух дыяметральна супрацьлеглых накірунках: добра адпачнуць і істотна прасунуцца ў справах. Кардынальныя і ў той жа час пазітыўныя перамены ў жыцці будуць залежаць ад умення належным чынам паказаць свае здольнасці. І, пры жаданні, вы зможаце прадэманстраваць іх найлепшым чынам. Пачынаючы з серады, удача будзе плыць вам у рукі, галоўнае — не ленавацца.

**РАК**. З'явіцца магчымасць разабрацца са складанымі сітуацыямі, якія ўзнікаюць. Памацнее ваша воля, стане лягчэй настойваць на сваім. Лішнія справы рашуча адмяніце — гэта спатрэбіцца вам і ў асабістым жыцці, і на рабоце. У панядзелак не варта хапацца за ўсё адразу — выдзеліце асноўныя накірункі, якімі неабходна заняцца. У аўторак практычна не будзе перашкод для дасягнення любой мэты. У чацвер знойдуцца сілы для ажыццяўлення самых смелых рашэнняў.

**ЛЕЎ**. У першай палове тыдня будзьце больш асцярожныя ў дзеяннях і ў выказванні свайго меркавання. У панядзелак верагодныя канфліктныя сітуацыі. Магчымы значны прыбытак ад сумеснага бізнэсу з энергічнымі партнёрамі. У пятніцу пастарайцеся не ўступаць у новыя канфлікты, адмоўцеся, па магчымасці, нават ад звычайнага абмену думкамі з навакольнымі. Аднак ад рызыкоўных праектаў на мяжы авантуры лепш адмовіцца.

**ДЗЕВА**. З'явіцца жаданне штосьці змяніць у жыцці, пры гэтым, што цікава, і магчымасць такая будзе. Вашу душэўную раўнавагу можа парушыць адчуванне, што згублены нейкі бліскучы шанц. Нічога падобнага! Наадварот, варта падзякаваць лёсу за тое, што вы шчасліва пазбеглі праблем, з гэтым шанцам звязаных. У аўторак не спяшайцеся з ініцыятывай — пастарайцеся спакойна выконваць свае паўсядзённыя абавязкі. Тыдзень спрыяльны для пашырэння галіны дзейнасці, кар'ернага росту, вырашэння сур'ёзных жыццёвых задач.

**ШАЛІ**. Зможаце бліснуць вострым розумам, у вас ёсць усе шанцы стаць незаменным у кампаніі. Прадэманструйце калегам вашы якасці лідара. Найбольш спрыяльныя дні на гэтым тыдні — чацвер і пятніца, неспрыяльны — аўторак. Парадуюць цікавыя навіны, перспектыўныя знаёмствы і важныя размовы. У панядзелак будзе магчымасць кінуць усе сілы на работу і паказаць, які вы каштоўны і незаменны работнік.

**СКАРПІЁН**. Могуць ажыццявіцца праекты, якія былі даўно адкладзены. Праявіце ініцыятыву і актыўнасць. Зараз вам па сілах самыя складаныя задачы. Аднак верагодныя праблемы ў асабістым жыцці. У суботу будзе цяжка схавацца ад непрыемнасцяў. Пастарайцеся не адчайвацца. Пад уплывам навакольных вы здольны разгарнуць бурную дзейнасць. Аднак памятайце, што цяжкая праца здольная падарваць здароўе, таму рабіце толькі тое, што сапраўды патрэбна асабіста вам.

**СТРАЛЕЦ**. Прыслухайцеся да таго, што гавораць іншыя. Не адкладвайце выкарыстанне шанца, які вельмі дарэчы падвярнуўся, далей, чым да серады, інакш ён сплыве ў іншыя рукі. Высокая працаздольнасць, добрае самаадчуванне і настрой стануць гарантыяй поспеху ў многіх галінах дзейнасці. У панядзелак пастарайцеся не аддаляцца ад навакольных, бо самым лепшым рашэннем будзе калектыўнае.

**КАЗЯРОГ**. Задача на тыдзень — сумленна выконваць сваю работу, а дзелавітасці і здольнасцяў у вас дастаткова. Падумайце пра будучыню. Не лішнім будзе прыслухацца да парад сяброў і калег, якім вы давяраеце. А вось грошы ў сумесны бізнэс зараз укладаць непажадана — не самы лепшы момант. Пачынаючы з сярэдзіны тыдня графік работы можа стаць вельмі напружаным — пастарайцеся не вельмі стаміцца да гэтага часу. Займайцеся творчасцю, часцей сустракайцеся з сябрамі — вам неабходна здымаць нервовыя перагрузкі.

**ВАДАЛЕЙ**. На вас можа абрушыцца шквал падзей і навінаў, таму варта дакладна прадумваць і расклад, і імідж. Не забывайцеся пра свой дом, пажадана больш часу прысвяціць навядзенню парадку, пазбаўцеся ад непатрэбнага хламу і старых рэчаў. У аўторак штосьці ці хтосьці моцна раззлуе вас, але не варта бушаваць — можаце атрымаць ад гэтай сітуацыі пэўную выгаду, калі захаваеце стрыманасць. Будзеце карыстацца поспехам у супрацьлеглага полу, навакольныя будуць захапляцца вамі і сімпатызаваць вам. У канцы тыдня вялікая верагоднасць з'яўлення людзей, здольных паўплываць на ваш лёс.

**РЫБЫ**. Усе кантакты павінны быць падпарадкаваны інтарэсам справы. Прадуманасць у дзеяннях пойдзе толькі на карысць вашай кар'еры. Нетрадыцыйны падыход дапаможа пры рэалізацыі творчых ідэй, задумаў і планаў. У сераду выкарыстоўвайце камунікабельнасць і кемлівасць, давярайце інтуіцыі. У пятніцу, перш чым штосьці зрабіць, неабходна прадумаць усё да дробязяў. Гэты дзень можа стаць самым складаным і насычаным днём тыдня. Заплануйце на выходныя дні што-небудзь незвычайнае і арыгінальнае.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.29 | 17.20 | 9.51 |
| Віцебск — | 7.22 | 17.06 | 9.44 |
| Магілёў — | 7.19 | 17.10 | 9.51 |
| Гомель — | 7.12 | 17.10 | 9.58 |
| Гродна — | 7.43 | 17.35 | 9.52 |
| Брэст — | 7.40 | 17.40 | 10.00 |

**Месяц**

*Першая квадра. Месяц у сузор'і Рака.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Ганны, Івана, Мікалая, Рамана, Сямёна, Уладзіміра, Уласа, Цімафея.*

***К.*** *Дануты, Юльяна, Даніэля, Севярына, Шымана, Юльяна.*

## НАДВОР'Е на заўтра




### ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА -2..0°С | КІЕЎ -7..-5°С | РЫГА 0..+2°С |
| ВІЛЬНЮС -3..-1°С | МАСКВА -9..-7°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ -2..0°С |

## 16 лютага

**Дзве даты**



**1957 год** — ураджэнец Беларусі Андрэй Грамыка назначаны міністрам замежных спраў СССР. Гэтую пасаду ён займаў да 1985 года.

**1893 год** — нарадзіўся Міхаіл Мікалаевіч Тухачэўскі, вядомы савецкі военачальнік, удзельнік грамадзянскай вайны, адзін з першых маршалаў Савецкага Саюза. Рэпрэсаваны ў 1937 годзе. Рэабілітаваны ў часы хрушчоўскай «адлігі».

**Цытата дня**

*«Лепш прайграць са сваімі, чым выйграць з чужымі, бо несапраўдная тая перамога, якая здабыта чужымі рукамі».*

**Нікола Макіявелі (1469—1527), італьянскі мысліцель, гісторык.**

## Усміхнёмся!

Дачнікі ў электрычцы:

— Вось у мяне ў садзе вырас яблык, я яго на табурэтку паклаў — яна зламалася!

— Гэта што. Я свой яблык паклаў на стол — разваліўся!

— А ў мяне вырас яблык, дык я яго паклаў на воз.

— І што — воз разваліўся?

— Не, але з яблыка вылез чарвяк і з'еў каня!

☺

**Самым складаным з вечных пытанняў з'яўляецца не «Што рабіць?» і не «Хто вінаваты?», а «Дзе ты бадзяўся, мярзотнік?!»**

☺

Рэкламнае.

— Скажыце, чаму вы карыстаецеся пастай «Блендамед», а не якой-небудзь іншай, больш таннай?

— Вось я дура-а-ань...

☺

**Алкаголь, безумоўна, мае дыстанцыйнае ўздзеянне. Напрыклад, ты толькі купіў бутэльку гарэлкі, яшчэ не выпіў ні грама, а настрой палепшыўся ўжо!**




# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БЕЗ РЭЦЭПТА

## Банан-лекар



**Банан у нас — больш чым проста фрукт, гэта жывое ўвасабленне далёкіх падарожжаў, трапічных джунгляў, дзіўных прыгод. Бананы заваявалі нашу любоў і сталі такімі ж роднымі і прывычнымі, як яблыкі і бульба. У Індыі, напрыклад, іх называюць «ежай мудрых». І гэта няздзіўна: многія ўсходнія філосафы ўсё жыццё харчуюцца ў асноўным пладамі бананаў.**

У бананах мала калорый, але многа вугляводаў, бялкоў, тлушчаў і крухмалу, які па меры выспявання ператвараецца ў натуральны лёгказасваяльны цукар. Ёсць у іх таксама натрый, кальцый, жалеза, фосфар, магній, вітаміны $B_6$, С, РР, Р. Таму яны вельмі пажыўныя і хутка заспакойваюць апетыт: з'еў два-тры бананы — і абедаць ужо не захочацца. Яны рэкардсмены па колькасці калію, які вельмі патрэбны людзям, што пакутуюць ад хваробы сэрца. Спелыя бананы валодаюць жаўцягоннымі і мачагоннымі ўласцівасцямі, таму іх можна ўключыць у рацыён пры захворваннях печані і нырак. А яшчэ бананы дапамагаюць загойванню слізістых абалонак пры язве страўніка і дванаццаціперснай кішкі.

**Пры гіпертаніі, ішэміі, дэпрэсіі і павышанай стамляльнасці:** з'ядайце па два жоўтыя бананы на дзень (не раней чым праз гадзіну пасля яды).

**Пры піеланефрыце, мочакаменнай хваробе, пры дыскінезіі жоўцевага пузыра** (калі запаволены адток жоўці): праз паўгадзіны пасля кожнага прыёму ежы з'ядайце палавінку спелага банана (вельмі павольна і старанна разжоўвайце кожны кавалачак).

**Пры язве страўніка і дванаццаціперснай кішкі, гастраэнтэраканіце:** узбіце да кашкападобнага стану мяккі спелы банан, дадайце лыжку аліўкавага алею і старанна перамяшайце. Прымайце сумесь у час абвастрэння да поўнага знікнення хваравітых сімптомаў па 1—2 ст. лыжкі кожныя дзве гадзіны.

**Пры неўрастэніі, павышанай раздражняльнасці:** тры-чатыры разы на дзень з'ядайце па палавіне зялёнага банана.

**Пры сухотах, астэахандрозе, рэўматызме, а таксама захворваннях шчытападобнай залозы:** з'ядайце па аднаму спеламу банану разам з лупінай.

**Пры апёках, нарывах, вугровым сыпе:** прыкладвайце да пашкоджаных участкаў скуры лупіну злёгку недаспелага банана (колер лупіны павінен быць жоўтым, але мякаць яшчэ цвёрдая).

**Пры запаленні горла і сухім кашлі:** пратрыце праз сіта спелы банан, заліце кашку дзвюма шклянкамі гарачай вады, перамяшайце, пастаўце на 10 хвілін на вадзяную лазню, астудзіце. Выпіце атрыманую сумесь на працягу дня невялікімі порцыямі.

**Пры артрозах і артрытах суставаў ног:** лупіну 4 бананаў заліце 3 шк. гарэлкі, настойвайце 40 дзён у цёплым месцы пры пакаёвай тэмпературы, працадзіце. Настойку ўцірайце ў хворыя месцы перад сном. Курс лячэння — 40 дзён.

*Увага! Бананы проціпаказаны пры цукровым дыябеце, а тым, хто пакутуе ад нястраўнасці і метэарызму, не трэба ўжываць у ежу свежыя плады. Бананы валодаюць моцным паслабляльным дзеяннем, таму не рэкамендуецца іх есці нашча і запіваць вадой.*

ДАПАМАЖЫ САБЕ САМ

## Цытрусавыя супраць прастуды

Інгаляцыі пры вострых рэспіраторных захворваннях могуць стаць не толькі карыснай, але і прыемнай працэдурай, калі скарыстаць для іх апельсінавую ці мандарынавую лупіну. Заварыце кіпенем лупіну апельсіна або двух мандарынаў, накрыйце сасуд і галаву ручніком і ўдыхайце пару на працягу некалькіх хвілін. Лятучыя эфірныя маслы лупіны цытрусавых аказваюць эфектыўнае бактэрыцыднае дзеянне на насаглотку. Насмарк і кашаль хутка пройдуць!

-2479-

НЕАБХОДНЫЯ ДРОБЯЗІ

## Надзейны памочнік — камбайн

**На сучаснай, добра аснашчанай кухні ёсць памочнікі, гатовыя выканаць усе пажаданні гаспадыні. Гаворка ідзе аб бытавой тэхніцы, сярод якой асабліваe месца належыць кухоннаму камбайну, што проста ўражвае сваімі магчымасцямі.**

**ПРАГМАТЫЧНЫ ПАДЫХОД**

Калі ў вас у доме ўжо ёсць кавамолка, электрамясарубка, міксер і сокавыціскалка, набываць камбайн немэтазгодна. Па звычцы вы ўсё роўна будзеце карыстацца старымі прыборамі. Калі ж набор бытавой тэхнікі абмяжоўваецца толькі сокавыціскалкай і кавамолкай, то мае сэнс набыць камбайн з мінімальным наборам дадатковых прыстасаванняў.

**ДАРАГІ, АЛЕ КАРЫСНЫ ПАДАРУНАК**

Кухонны камбайн будзе вельмі дарэчы для навасёлаў, якія вырашылі абсталяваць кухню сучаснай тэхнікай. Тым больш, што асобна набытыя прыборы абыдуцца значна даражэй, чым адзін камбайн. А яшчэ камбайн ідэальны ў якасці падарунка для маладажонаў, якія пачынаюць весці гаспадарку «з нуля».

**МАГУТНАСЦЬ, ХУТКАСЦЬ, АБ'ЁМ**



- Першараднае значэнне мае дыяпазон хуткасцяў, таму што нельга з аднолькавай хуткасцю замешваць цеста і апрацоўваць пячонку для паштэту.
- Аб'ём чашы падбірайце ў залежнасці ад колькасці членаў сям'і, каб не давялося апрацоўваць прадукты ў некалькі прыёмаў. Зручныя тыя камбайны, у якіх чаша мае электравагі. Засыпаючы прадукты, вы адразу атрымаеце інфармацыю аб іх масе.
- Звярніце ўвагу на магутнасць камбайна. Пры слабым маторы замешванне цеста будзе ці няякасным, ці зойме шмат часу, што ў сваю чаргу можа прывесці да паломкі матора.
- Чым больш складаная мадэль камбайна, тым больш спатрэбіцца і месца для яго захоўвання. Некаторыя мадэлі маюць спецыяльныя падстаўкі для насадак. З іх дапамогай можна кампактна размясціць камбайн, каб ён заўсёды быў пад рукою ў патрэбны момант.

ЖАНОЧЫЯ ХІТРАСЦІ

## Завяжыце шалік прыгожа

**Сёння модна насіць шалікі зверху адзення ці дапаўняць імі касцюм. Таму шалік павінен спалучацца з агульнай колеравай гамай усяго камплекта, а завязваць яго можна па-рознаму.**

- Складзіце шалік папалам, накіньце на шыю, свабодныя канцы прасуньце ў пятлю, якая ўтварылася, прыгожа выпрастайце.
- Накіньце шалік на шыю, перакрыжуйце канцы. Адзін з іх прапусціце зверху ўніз у кальцо вакол шыі, ссуньце вузел набок.
- Накіньце шалік на шыю так, каб канцы апынуліся ззаду, перакрыжуйце іх і завяжыце. Адзін канец працягніце праз кальцо вакол шыі наверх, другі працягніце ўперад (пры гэтым вузел апынецца збоку).
- Накіньце шалік на шыю так, каб адзін канец быў даўжэйшы. Яго і закіньце за плячо.
- Тонкі не вельмі доўгі шалік накіньце на шыю, каб канцы апынуліся ззаду. Выпрастайце шалік спераду, каб атрымаўся як быццам каўнер світара. Канцы закруціце жгутом і завяжыце любым вузлом спераду.
- Калі вы выбралі шалік з махрамі, адзін яго канец пакладзіце крыху ніжэй чым шыя і старанна выпрастайце на грудзях, другім канцом абкруціце шыю і прапусціце яго знізу ўверх праз кальцо, якое ўтварылася.

-2480-

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.018. Індэкс 63850. Зак. № 878. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

